PL ISSN 0546-1960
NR INDEKSU 366714

# Ніва

ТЫДНЁВІК
БЕЛАРУСАЎ
У ПОЛЬШЧЫ

http://niva.iig.pl
redakcja@niva.iig.pl

№ 28 (2461) Год XLVIII | Беласток, 13 ліпеня 2003 г. | Цана 2,00 зл.

## Краявід пасля перапісу

Яўген Мірановіч

Апублікаваны тры тыдні таму *Raport z wyników narodowego spisu powszechnego ludności i mieszkań 2002* з'яўляецца вельмі цікавым, у большасці насычаным табліцамі, матэрыялам для аналізу. З некалькіх тысяч лічбаў вырысоўвацца грамадскі краявід Польшчы. Аднак, не надта аптымістычны.

У 2002 г. у краіне было 5,4 млн. інвалідаў. Выглядае на тое, што кожны сёмы грамадзянін Польшчы патрабуе дапамогі па прычыне дрэннага здароўя. Некаторыя аналітыкі перапісу падазраюць, што каля паловы гэтых інвалідаў маглі б працаваць без шкоды для свайго здароўя. Другой катэгорыяй, якая стварае песімістычны вобраз грамадства, гэта 2,4 млн. пражываючых адзінока ўдоў. Абазначае гэта, што мужчыны жывуць у Польшчы надта коратка. У гарадах кожная чацвёртая жанчына пражывае адзінока, а на вёсках 35 працэнтаў нежанатых мужчын. Разам састарэлыя халасцякі складаюць амаль пяцімільённую армію мужчын, якая не спрыяе павышэнню натуральнага прыросту. Усё гэта адбываецца ў сітуацыі, калі на 100 мужчын выпадае ў сярэднім у краіне 106 жанчын.

Перапіс паказаў, што ў апошніх гадах нараджаецца вельмі мала дзяцей. Амаль кожнае чацвёртае сужонства не мае іх увогуле. У параўнанні да папярэдняга перапісу ад 1988 г., грамадзян ва ўзросце ад 1 да 14 гадоў было напалову менш. Затрат не рэкампенсуюць дзеці народжаныя незамужнімі жанчынамі. Хаця такіх дзяцей нараджаецца значна больш чым раней, але не ўплывае гэта на агульную мала аптымістычную статыстыку. Абазначае гэта, што грамадства вельмі хутка старэецца. Штораз менш людзей працуе і штораз больш патрабуе дапамогі з боку дзяржаўнага бюджэту. Апрача ўспомненых інвалідаў працоўныя вымушаны выпрацаваць сродкі яшчэ на ўтрыманне пенсіянераў, беспрацоўных і на шматлікія сацыяльныя дадаткі тым, якія зарабляюць вельмі мала. Фактычна перапіс паказаў, што без працы ў 2002 г. было 3,6 мільёна працаздольных грамадзян.

У адрозненне ад жыхароў Заходняй Еўропы і Злучаных Штатаў Амерыкі палякі гэта народ, які моцна трымаецца месца свайго нараджэння. Больш за 60 працэнтаў грамадзян не памяняла адрасу месца пастаяннага пражывання ад часа свайго нараджэння. Найбольш стабільныя ў гэтым плане жыхары ўсходніх ваяводстваў. У Злучаных Штатах толькі 15 працэнтаў грамадзян пражывае ў месцы нараджэння, у краінах Еўрасаюза — больш за 32 працэнты. У Польшчы нават там, дзе надзея атры-

[працяг ☞ 2]



Фота АЛЯКСЕЯ МАРОЗА

*Калектыў „Незабудкі" (пятая справа кіраўнік Ніна Грыгарук)*

## А ў Курашаве заўсёды спявалі

Аляксей Мароз

З нагоды дваццаціпяцігоддзя дзейнасці вакальнага калектыву „Незабудкі" 22 чэрвеня наладжаны быў у Курашаве беларускі фэст. Яго арганізатары — войт Чыжоўскай гміны, Вясковая рада Курашава, калектыў „Незабудкі" і Гмінны асяродак культуры ў Чыжах запрасілі на мерапрыемства беларускія калектывы з Чыжоўскай і суседніх гмін. Іх выступленні папоўніў калектыў „Грымата" са Слоніма. На фэст прыбылі старшыня Галоўнага праўлення БГКТ і член управы Ваяводскага сейміка Ян Сычэўскі і стараста Гайнаўскага павета Уладзімір Пятрочук.

Мерапрыемства распачалося з канцэрта калектыву „Незабудкі". Жанчыны з Курашава заспявалі новаапрацаваныя песні і вярнуліся да старога рэпертуару. Ад самага пачатку спяваюць у калектыве Ніна Грыгарук, Яніна Грыгарук і Мар'я Яканюк. Ніна Грыгарук з'яўляецца кіраўніком калектыву. Працуючы ў вясковым клубе ў Курашаве кіравала яна дзейнасцю калектыву і арганізавала вясковае культурнае жыццё. У вялікім мураваным клубе былі арганізаваны сустрэчы і танцы.

— Раней было інакш, бо былі мы маладыя. Хацелася спяваць і выступаць. Цяпер мы старэйшыя. Няма ўжо такога слыху і галасы слабейшыя, — кажа Ніна Грыгарук. — Аднак мы не здаемся і выступаем надалей. Калі будуць спонсары, будзем яшчэ ездзіць на агляды і канцэрты.

Зараз у калектыве „Незабудкі" спяваюць шэсць жанчын. Апрача ўзгаданых выступаюць Ірэна Заянчкоўская, Ірэна Несцярук і Зінаіда Мартынюк. На акардэоне акампаніруе ім Сяргей Аўксянцюк.

— Я сустракаўся з „Незабудкамі" з Курашава з 1987 года. Прэзентавалі яны вельмі добры ўзровень. Мелі свае непаўторныя песні. Ніна Грыгарук умее пакіраваць хорам, падбірае адпаведны рэпертуар, які радуе і весяліць публіку, — успамінае інструктар Ваяводскага асяродка анімацыі культуры Сцяпан Копа. Уручыў ён калектыву з Курашава пахвальную грамату ад дырэктара ВААК Анджэя Дырдала. Ірэна Заянчкоўская атрымала ад міністра культуры адзнаку „Заслужаны дзеяч культуры". Іншыя члены калектыву атрымалі такія адзнакі ў 1997 годзе, калі святкавалі дваццацігадовы юбілей. Як заявіла Ніна Грыгарук, дата ўзнікнення калектыву ўмоўная. Першы раз жанчыны з Курашава спявалі ў час паватовых дажынак у Гайнаўцы ў 1974 годзе. Аднак пастаянна пачалі выступаць пасля дажынак у Курашаве ў 1977 годзе і гэтую дату прынялі за момант заснавання калектыву. У мінулым годзе не атрымалася наладзіць юбілейнае спатканне і таму сёлета „Незабудкі" святкуюць юбілей. Затое мерапрыемства прайшло вельмі ўдала. Выступілі „Арэшкі", „Тыневічанкі", „Чыжаўяне" і „Збучанкі", якія заспявалі мясцовыя фальклорныя песні. Калектыў „Грымата" зацікавіў публіку песнямі запісанымі ў Беларусі. Толькі дождж перашкодзіў канцэрту пад адкрытым небам. Арганізатары вымушаны былі перанесці мерапрыемства ў клуб. Побач жыхароў Курашава сабраліся людзі з суседніх вёсак і ўсе глядачы не памясціліся ў вялікай канцэрт-

[працяг ☞ 3]

### Памяці Васіля Быкава ☞ 2

І праз некаторы час, калі з дэмакратыяй, свабодамі і правамі чалавека ў Беларусі ўзнікаюць сур'ёзныя праблемы, Васіль Быкаў становіцца адным з тых, хто рэзка крытыкуе сучаснае кіраўніцтва краіны. Але і яно, у сваю чаргу, не надта лагодна ставіцца да пісьменніка, называючы яго палітычна адсталым.

### Працяг вайны ў Саюзе палякаў ☞ 4

Пасля гарачых вясновых баталій з галадоўкай і кароткага „зацішша" ў гродзенскай сядзібе Саюза палякаў Беларусі назіраецца новы віток канфрантацыі. Як і чакалася, цяперашні старшыня СПБ імкнецца ўсімі сродкамі пазбыцца сваіх апанентаў, якія абвінавачваюць яго ў парушэнні статута і фінансавых махінацыях.

### З галоўным прызам ☞ 5

Барбара Якубюк з Гайнаўкі ў рамках праекта „У Еўропе аднолькавыя шанцаў" выйграла галоўны прыз: набор дапаможнікаў для вывучэння англійскай мовы. Піша яна вершы на польскай і беларускай мовах. Закончыла вучобу ў гімназіі і паступіла ў Гайнаўскі белліцэй. Ад верасня пачне вучыцца англійскай мове.

### Памінальны май ☞ 9

Другое памінанне адбылося на могілках у Гневе. Там гданьскія беларусы пры ўдзеле мясцовых элітаў адкрылі помнік Андрэю Вангіну — даўняму члену БГКТ, а ў міжваенны перыяд — акцёру тэатра Уладыслава Галубка.

### Нашы дамы, наша спадчына ☞ 10

Некаторыя сцвярджаюць, што наданконныя ліштвы і абійку вуглоў вырэзвалі па шаблонах, прывезеных у дваццатых гадах бежанцамі. У тым часе многія вёскі на Падляшшы згарэлі. Вяртаючымся бежанцам часта прыходзілася ставіць будынкі ад фундаментаў. Можа невядомая тут раней мода багатай арнаментоўкі ўзнікла як успамін па дамах з наваколля Архангельска, Масквы...

### Помнік прыроды ☞ 11

Побач дарогі з Касцюкоў у Харошчу расце велічная сасна — помнік прыроды. У ранейшы час яна расла адзінока і ніхто ёй не перашкаджаў дасцігнуць буйных размераў. Сёння навокал яе поўна маладога напорыстага беразняку і сасняку, якія неўзабаве, быццам Геракл Антэю, адбярэ ёй жыццядайныя сокі зямлі.

# Беларусь — беларусы

## Краявід пасля перапісу

[1 ☞ працяг]
мання працы цалкам адсутнічае, людзі рэдка пакідаюць свае хаты для пошукаў лепшых перспектыў у іншых ваяводствах.

Ад 1988 г. амаль удвая пабольшыўся адсотак людзей з вышэйшай адукацыяй. Перапіс не дае адказу пра якасць гэтае адукацыі. Павятовыя і гмінныя акадэміі і універсітэты часам прадстаўляюць узровень адукацыі ніжэйшы чым добрая пачатковая школа. Таму колькасць дыпломаў не сведчыць пра ўзровень адукаванасці грамадства. Дакумент такі, аднак, адкрывае ўласніку шырэйшыя перспектывы ў пошуках працы. Перапіс адназначна паказвае, што найменш беспрацоўных сярод людзей з вышэйшай адукацыяй і найбольш — з пачатковай.

У 2002 г. праца давала сродкі на ўтрыманне амаль 52 працэнтам сямействаў (у 1988 г. адсотак гэты дасягаў 73 працэнты). Амаль 42 працэнты сямействаў пражывалі за кошт пенсій і ўсялякіх сацыяльных фондаў, 4 працэнты былі фінансаваны сваякамі і ўсялякімі іншымі прыватнымі спонсарамі. Толькі 0,1 працэнта грамадзян мела сродкі з капіталу, якім распараджаліся. Хаця на вёсках у Польшчы пражывае каля 38 працэнтаў насельніцтва, праца на сельскай гаспадарцы давала сродкі на ўтрыманне толькі 5,8 працэнтам сямействаў.

Перапіс паказаў, што за апошнія 14 гадоў прайшлі ў Польшчы не толькі вялікія палітычныя змены, але перш за ўсё эканамічныя, грамадскія і псіхалагічныя. Сталі фактам сямействы без фармальнага кантракту, самотныя жанчыны без страху і пачуцця кампраметацыі нараджаюць дзяцей, жыццё грамадзяніна стала больш прыватным. З другога боку, апрача інвалідаў і пенсіянераў, кожны сам сабе вымушаны ствараць умовы штодзённага выжывання, а таксама клапаціцца пра будучыню. Малапраўдападобна, што сучасныя падаткаплацельшчыкі ва ўзросце 40-50 гадоў калі-небудзь атрымаюць хаця б частку адведзеных грошай для публічнага карыстання.

Яўген Міранові

## Семінар па супрацоўніцтве з Беларуссю

24 чэрвеня г.г. Raiffeisen Bank Polska S.A. сумесна з Адкрытым акцыянерным таварыствам Приорбанк правялі ў Варшаве семінар для польскіх прадпрымальнікаў, якія намерваюцца ўвайсці на беларускі рынак. Семінар праходзіў пад лозунгам „На Усход без боязі або як паспяхова працаваць на беларускім рынку".

У семінары прынялі ўдзел спецыялісты Raiffeisen Bank Polska S.A., ААТ Приорбанк, Міністэрства гаспадаркі, працы і сацыяльнай палітыкі Польшчы, карпарацыі страхавання экспартных крэдытаў (KUKE), Таварыства Польшча-Усход. У ходзе семінара разглядаліся пытанні гандлёва-эканамічнай палітыкі Беларусі, эканамічнага патэнцыялу і інвестыцыйнай праграмы, ажыццяўлення фінансавых аперацый, крэдытна-інвестыцыйнага супрацоўніцтва, крэдытавання экспарту, арганізацыйна-прававых норм супрацоўніцтва, рэгістрацыі камерцыйных прадпрыемстваў з замежным капіталам, а таксама вопыт працы польскіх фірм на беларускім рынку.

Галоўнай мэтай семінара было прадстаўленне актуальнай інфармацыі аб стане і шляхах развіцця супрацоўніцтва польскіх прадпрыемстваў і фірм з беларускімі партнёрамі. На канкрэтныя пытанні ўдзельнікаў семінара адказвалі спецыялісты Приорбанка, Свабоднай эканамічнай зоны „Брэст", Пасольства РБ у Польшчы. Віцэ-прэзідэнт праўлення Raiffeisen Bank Polska S.A. Яраслаў Дамброўскі паведаміў удзельнікам семінара, што банкам ужо прынята рашэнне аб выдзяленні да 15 млн. еўра на рэалізацыю канкрэтных праектаў на тэрыторыі Беларусі.

www.mfa.gov.by

## Заклік у справе віз

Аздараўляльнаму плану Падляшскага ваяводства і першым дыскусіям над планам прасторавага добраўпарадкавання прысвечана была апошняя сесія Падляшскага сейміка.

Аб прасторавым плане напішам у наступным нумары. Тым часам у час дэбаты над аздараўляльным планам апазіцыя не пакінула сухой ніткі на яго стваральніках (працаўніках маршалкоўскай установы). Закінула дакументу нязвязнасць і брак логікі. Прадстаўнікі кіруючай кааліцыі, галоўным чынам з СЛД, спрабавалі абараняцца, аднак прыпаміналі, што дагэтуль няма адпаведных распараджэнняў, чым меў бы быць такі план, які ў першай версіі меў служыць як дапамога дзеля вызначэння патрэб, а затым сродкаў на лекавую апеку аддзеламі Нацыянальнага фонду аховы здароўя. А затым прапанавалі (хоць беспаспяхова), каб праект плана адкінуць.

Ваяводскія радныя выказаліся ў справе ўвядзення візавага рэжыму паміж Польшчай і Беларуссю (прадбачанага ад 1 кастрычніка). Заклікалі, каб перш за ўсё ўвесці спрошчаны і бясплатны прыгранічны рух паміж абедзвюма краінамі, увесці такія стандарты абслугі грамадзян дабіваючыхся віз, каб праводзілася гэта спраўна і без перабояў. Да таго прапануюць арганізаваць новыя пагранпераходы і весці акуратную інфармацыйную кампанію аб спосабе выдавання віз і далейшыя перамовы з мэтай памяншэння цэн. На думку радных, гэта важна м.інш. з прычыны неабходнасці развівання партнёрскіх кантактаў з суседняй Рэспублікай Беларусь і з пункту гледжання лакальных шанцаў развою гарадоў і гмін Падляшскага ваяводства.

(мах)

# Памяці Васіля Быкава

Горкая навіна аб смерці Васіля Быкава абышла свет. І дагэтуль цяжка ўсвядоміць, што цяпер ужо няма сярод жывых чалавека, адно імя якога атаесамляецца з праўдай жыцця, з сапраўднымі здарэннямі вялікіх для Беларусі гістарычных падзей. За мінулае стагоддзе іх было не так і многа — БНР, БССР, ІІ сусветная вайна, набыццё Беларуссю незалежнасці. Сведкамі дзвюх апошніх — людзі, якія жывуць сёння. Аднак распавесці аб гэтых падзеях так праўдзіва і без хлуслівых упрыгожанняў мог хіба толькі гэты вялікі пісьменнік, які быў не толькі іх назіральнікам, але і найактыўнейшым удзельнікам.

Васіль Быкаў нарадзіўся ў 1924 годзе і, зразумела, вайна не абышла яго бокам. Ён не толькі ўдзельнічаў у ёй, а нават на ёй і „загінуў". На Украіне пад Кіраваградам, дзе ваяваў Быкаў, на брацкай магіле савецкіх салдат упісаныя і яго імя з прозвішчам. Натуральна, гэта памылка, якіх здаралася ў тое ліхалецце вельмі шмат і спадзеючыся на якія, людзі дагэтуль чакаюць сваіх родных з той вайны.

Былы франтавік увайшоў у літаратуру, спачатку савецкую, а потым сусветную, менавіта як „ваенны" пісьменнік. Але галоўным адрозненнем яговых твораў была так званая „акопная праўда", якая не заўсёды адпавядала гераічнаму пафасу барацьбы. Бо Быкаў узнімаў на шчыт не ідэалагічны чыннік пры напісанні той ці іншай аповесці, а чалавека, людзей з іх узаемаадносінамі, з іх характарамі звычайнымі, а не паказальна-гераічнымі. Што, дарэчы, цалкам адпавядала і заўсёды будзе адпавядаць жыццю.

Менавіта за сваю „акопную праўду" Васіль Быкаў сутыкаўся з неразуменнем, што зыходзіла „зверху". Але да яго, як і да заслужанай пашаны ставіўся спакойна.

У той жа час неспакойна ён паставіўся да „перабудовы" — таго моманту ў жыцці роднай краіны, калі попыт на праўду ўзняўся рэзка ўверх. У выніку, пісьменнік Васіль Быкаў аказаўся сярод тых, каго цікавяць раскрытыя архівы дзяржбяспекі, поўная праўда аб рэпрэсаваных, хто прагне дэмакратыі і свабод для ўласнага народа, і ў выніку, адраджэння Беларусі. Такая пазіцыя робіць з пісьменніка-франтавіка грамадскага дзеяча. І праз некаторы час, калі з дэмакратыяй, свабодамі і правамі чалавека ў Беларусі ўзнікаюць сур'ёзныя праблемы, Васіль Быкаў становіцца адным з тых, хто рэзка крытыкуе сучаснае кіраўніцтва краіны. Але і яно, у сваю чаргу, не надта лагодна ставіцца да пісьменніка, называючы яго палітычна адсталым, які нічога новага ўжо не створыць. Так, прынамсі, заявіў галоўны рэдактар „Інфармацыйнага веснікa адміністрацыі прэзідэнта РБ" Эдуард Скобелеў.

Такое стаўленне, ды і агульная сітуацыя ў Беларусі, вымушаюць Васіля Быкава з'ехаць з краіны. Ён не хавае, што ў яго з уладай прынцыповыя ідэйныя разыходжанні. Ды і не магло быць інакш, калі пісьменнік усё жыццё пісаў праўду і прагнуў яе, а цяперашняя ўлада на тую праўду, мякка кажучы, заплюшчвае вочы.

Цяжка было Васілю Быкаву на Радзіме, але і чужына не аблягчае той цяжар. Пісьменнік жыве ў Фінляндыі, Германіі, Чэхіі. І ў апошнія гады піша своеасаблівае абагульненне свайго жыцця. „Доўгая дарога дадому" — так называецца кніжка, якая, дзякуй Богу, убачыла свет яшчэ пры жыцці аўтара.

Мабыць, адчуваючы халодны подых смерці, цяжка хворым на рак Быкаў вяртаецца на Радзіму.

Пахаванне Пісьменніка пераўтварылася ў сапраўдную народную жалобу. Дзесяткі тысяч чалавек прыйшлі развітацца з Ім. Сярод іх аднак не было першага прэзідэнта краіны. Магчыма, на першы погляд, з боку ўлады было зроблена дастаткова, для ўшанавання памяці Быкава — выдаткаваны грошы на пахаванне, быў некралог ад імя прэзідэнта, створана дзяржаўная камісія і мелася ў наяўнасці ганаровая вайсковая варта. Гэта ўсё было, каб ушанаваць Быкава-франтавіка, Быкава-пісьменніка. Але абыякавае стаўленне да Быкава-грамадскага дзеяча, Быкава-маральнага арыенціра беларусаў прывяло да таго, што не абышлося без скандала. Калі сын пісьменніка накрыў цела бацькі бел-чырвона-белым сцягам дзяржаўная камісія на чале з міністрам культуры Леанідам Гулякам і ганаровай вайсковай вартай пакінулі залу развітання. Бо як прадстаўнікі дзяржавы яны не бачылі для сябе магчымасці стаяць побач з нацыянальнай сімволікай. А тое, што гэтая дзяржава ў 1991 годзе набыла сваю незалежнасць менавіта пад „Пагоняй" і бел-чырвона-белым сцягам яны не ўспомнілі. Як і не ўспомнілі тыя вайскоўцы, якія праз год пад гэтым сцягам прысягалі на вернасць Беларусі. Праўрадавыя сродкі масавай інфармацыі абвінавацілі апазіцыю ў пераўтварэнні пахавання ў дэманстрацыю.

Апафеозам пакрыўджанага ўладнага крывадушша стала дэпартацыя з Беларусі за праўдзівы расповед аб жыцці Быкава і яго пахаванні карэспандэнта расійскай кампаніі НТВ Паўла Селіна. На 5 гадоў яму забаронены ўезд у беларускую краіну. Вось табе і „адзіная саюзная дзяржава Расіі і Беларусі".

Людзі дагэтуль ідуць і ідуць на магілу Пісьменніка. Таксама як далей і далей працягваецца раскол у грамадстве, што ініцыюе далёка не мудрая ўлада. Бо нават смерць Васіля Быкава не здолела хаця б на некалькі дзён спыніць процістаянне, каб ад шчырага сэрца ля труны сказаць яму „прабач і бывай".

Уладзімір Лапцэвіч

## Беларускае консульства ў Белай-Падляшскай

У Белай-Падляшскай адкрылася Консульства Рэспублікі Беларусь. Узначальвае яго Ігар Сякрэта, раней намеснік генеральнага консула РБ у Беластоку.

Беларускі бок адкрыў консульства ў сувязі з увядзеннем Польшчай з 1 кастрычніка г.г. візавага рэжыму. Але задачай новага дыпламатычнага прадстаўніцтва будзе не толькі выдача віз. Консульства будзе садзейнічаць развіццю супрацоўніцтва паміж абедзвюма дзяржавамі і прыгранічнымі рэгіёнамі.

Сядзіба новага консульства невыпадковая. Белая-Падляшская распалажаная побач польска-беларускіх дарожных і чыгуначных пагранпераходаў — у Тарэспалі, Славатычах, Кукурыках і Малашэвічах, а побач горада праходзіць транзітная дарога з заходняй Еўропы цераз Варшаву ў Беларусь і Расію.

У Польшчы працуюць чатыры беларускія дыпламатычныя ўстановы — у Варшаве, Беластоку, Гданьску і Белай-Падляшскай. (паводле ПАП)

# Чаму жыхары Арлянскай гміны пагрэбавалі рэферэндумам

Жыхары Арлянскай гміны сказалі „за” далучэнню да Еўрасаюза, аднак удзел у апытанні быў рэкордна малы — найменшы ў маштабе краіны. Пра рэкорд інфармавала агульнапольскае тэлебачанне, а зараз пасля апытання ў Орлю паспяшала каманда тэлекампаніі TVN.

Рэферэндум на тэрыторыі гміны прайшоў спакойна. Галасаванне адбывалася ў чатырох участках: Дыдулях, Пашкоўшчыне і двух у самой Орлі; я быў членам камісіі ў арлянскім участку н-р 2, якая працавала ў школьным будынку. Гэты ўчастак ахопліваў вёскі Кашалі, Міклашы, Вулька, Спічкі і Шарні. У першы дзень з 656 законных выбаршчыкаў прагаласавала толькі 25 асоб. Камісія спадзявалася, што ў нядзелю, калі людзі тлумна ідуць у царкву — а ў той дзень выпадала яшчэ і свята Сямёна Стоўпніка, якое адпраўлялася каля капліцы акурат побач школы — на ўчастак прыйдзе мнагалюдны натоўп выбаршчыкаў. Але так не сталася — за цэлы дзень прыйшла толькі 131 асоба. У цэласці праз два дні ў гэтым участку было выдадзена 156 выбарчых білетаў: „за” было 120, „супраць” — 30, а 6 галасоў было несапраўдных. Ува ўсёй гміне на 3 212 упаўнаважаных асоб удзел у апытанні прыняла 891 асоба (27,73%); „за” галасавала 655 чалавек (74,60%), „супраць” — 223 (25,40%).

Што магло быць прычынай такога кволага зацікаўлення? Можна падазраваць, што жыхары гміны з'яўляюцца пажылымі людзьмі і ім цяжка дабрацца на выбарчы ўчастак. Аднак аказваецца, што не!

Як паведаміла мне сакратар гміны Ірэна Адзіевіч, кожнае салэцтва мела магчымасць заказаць гмінны аўтобус для давозу людзей. Аднак на 22 салэцтвы заяўкі падало адно тры: са Шчытоў, Шарнёў і Спічок. Але калі дайшло да выбараў, два з іх адмовіліся. Аўтобус з'ездзіў толькі ў Шарні, адкуль на ўчастак прывёз усяго адну асобу.

Сярод апытаных мною асоб старэйшыя людзі адказвалі: „Еўрасаюз не дасць нам нічога добрага і напэўна не будзе лепш, але яшчэ горш — горш чым пасля вайны”. Іншыя гаварылі: „Нам Еўрасаюз асацыюецца з упадкам праваслаўнай тоеснасці”. А маладыя гаварылі: „Я трахаю Вунію! На Захадзе таксама ёсць беспрацоўе. А бедны, беспрацоўны чалавек з Польшчы на Захад за працай ніколі не паедзе. Еўрасаюз толькі для прывілеяваных...”

Некаторыя дэманстратыўна грэбавалі рэферэндумам, напрыклад у Пашкоўшчыне, калі прысутнічалі побач выбарчага ўчастка, а галасаваць не ішлі. Галасаванню спрыяла і выдатнае надвор'е; маладыя апытальнікі з фірмы „Demoskop”, якія дзяжурылі перад участкамі, маглі ўволю загарацца. А камісіі — па дзесяць чалавек у кожнай — таксама не напрацаваліся.

* * *

Працаўнікі тэлеканала TVN, якія зараз пасля рэферэндуму наведалі Орлю па прычыне рэкорднай тут абыякавасці апытанням і магчыма ў пошуках сенсацыі, фільмавалі доўга і многа, але ў эфір пусцілі толькі скрупулёзна падабраны матэрыял, паказваючы Орлю беднай і адсталай. Мо яны хацелі так адмоўна паказаць нашу мясцовасць таму, што яна праваслаўная і на ўсходнім памежжы. Хаця галасавала тут мала, аднак большасць выказалася за далучэнне да Еўрасаюза. А згаданага тэлеканала зусім не зацікавіла іншая мясцовасць у краіне — Гадзішаў у Люблінскім ваяводстве, — у якой жыхары амаль стопрацэнтна выказаліся супраць далучэння Польшчы да Еўрасаюза.

Міхал Мінцэвіч



Фота Аляксея Мароза

*Публіцы спадабалася выступленне калектыву „Грымата”*

# А ў Курашаве заўсёды спявалі

[1 ☞ працяг]

най зале. Некаторыя слухалі беларускіх песень, стоячы звонку клуба.

У час віншавальных выступленняў „Незабудкі” пачулі многа цёплых слоў. Войт Чыжоўскай гміны Юрый Васілюк гаварыў, што калектыў вельмі ўдала расслаўляе сваю гміну па-за яе межамі. Заўважыў, што жыхары Курашава ўмеюць захаваць аўтэнтычны фальклор. Сям'я Несцерукоў з Курашава, якая выступала на фэсце, таксама адклікалася да фальклорных беларускіх песень. Лозунг „А ў Курашаве заўсёды спявалі”, які ўзнік у мінулым, сёння не страціў на актуальнасці. Два калектывы з Курашава ўмела працягваюць вясковыя традыцыі. Прымаюць удзел у фэстах і канцэртах.

Да пахвальных слоў войта далучыліся госці. Кветкі і падарункі атрымалі „Незабудкі” ад прадстаўнікоў самаўрадавых улад і членаў прыбылых калектываў. Паколькі жанчыны з калектыву спяваюць у царкоўным хоры, вялікі букет кветак перадаў ім настаяцель прыхода ў Курашаве. Пасля юбілейнага канцэрта наладжаны быў абед. У час вясковай забавы іграў маладзёжны калектыў.

Аляксей Мароз

# Для пушчы і яе жыхароў

Бэн Слэй, дырэктар Рэгіянальнага бюро Праграмы развіцця Арганізацыі Аб'яднаных Нацый (UNDP) у Браціславе, Ніл Бунэ, пастаянны прадстаўнік ПРААН у Беларусі і Колін Глэні, пастаянны прадстаўнік ПРААН у Польшчы ў прысутнасці мясцовых улад Гайнаўшчыны падпісалі 5 чэрвеня ў Белавежы праект рэгіянальны ПРААН, які тычыцца развіцця тэрыторый распаложаных у Белавежскай пушчы і побач яе. Фінансаваны будзе ён са сродкаў Рэгіянальнай праграмы ПРААН, бюро ПРААН у Беларусі і бюро ПРААН у Польшчы. Прадбачваецца, што праект будзе рэалізаваны дзеля ўраўнаважанага развіцця тэрыторый Белавежскай пушчы па абодвух баках мяжы, з захаваннем натуральнай спадчыны. Прадстаўнікі ПРААН і мясцовых улад пераканаsuccessfully, што ахова натуральнай і культурнай спадчыны тэрыторый у Белавежскай пушчы і побач яе можа прычыніцца да гаспадарчага развіцця Еўрарэгіёна „Белавежская пушча”. Прадбачваецца, што на праект, які будзе рэалізаваны на працягу двух гадоў, будзе выдаткаваных 830 тысяч злотых. Хаця рэалізацыя вялікіх гаспадарчых інвестыцый са сродкаў ПРААН не прадугледжваецца, то ў рамках праекта будуць рыхтавацца ўмовы для іх рэалізацыі на тэрыторыі Еўрарэгіёна „Белавежская пушча”.

ПРААН дзейнічае на тэрыторыі Польшчы з 1990 года і рэалізуе тры асноўныя праграмы: грамадскай інтэграцыі, аховы асяроддзя і добрага ўпраўлення. Гэтыя праграмы будуць рэалізаваныя на тэрыторыі Еўрарэгіёна „Белавежская пушча”. Задачай праграмы добрага ўпраўлення будзе дапамога публічнай адміністрацыі ў паляпшэнні яе дзейнасці і пабольшванні магчымасцей выкарыстання дапаможных сродкаў з Еўрасаюза. Паляпшэнне аховы асяроддзя будзе рэалізаванае на тэрыторыі Белавежскай пушчы ў Польшчы і Беларусі. Прадбачваецца, што прычыніцца да лепшага турыстычнага развіцця тэрыторый распаложаных у Белавежскай пушчы і яе наваколлі. На Гайнаўшчыне будзе рэалізаваная агульнапольская задача дапамогі самым бедным рэгіёнам Польшчы. На практыцы можа гэта абазначаць дапамогу экспертаў у падрыхтоўцы праектаў фінансавання экалагічных і гаспадарчых інвестыцый са сродкаў Еўрасаюза і еўрапейскіх фондаў. Прадстаўнікі ПРААН змогуць хадайнічаць за рэалізацыю праектаў у еўрапейскіх арганізацый.

ПРААН займаецца аховай натуральнага асяроддзя ў Польшчы дзякуючы Сусветнаму фонду асяроддзя, дапамозе ўрада і мясцовых улад. Ад 1994 года Польшча атрымала на ахову асяроддзя з гэтага фонду 8,5 млн. долараў. Прадбачваецца выдаткаванне ў Польшчы на экалагічныя інвестыцыі з 2004 па 2007 год 9 млн. долараў з Сусветнага фонду асяроддзя, якія часткова будуць выкарыстаны ў Еўрарэгіёне „Белавежская пушча”. Аднак, поспехі ў рэалізацыі падпісанага праекта будуць залежаць ад актыўнасці мясцовых самаўрадаў.

Аляксей Мароз

# Ліквідацыя абмежаваная

Польская дзяржаўная чыгунка (ПКП) прадбачыла, што ад паловы ліпеня будзе ліквідаваць не дваццаць, а чатыры цягнікі на шляхах Беласток — Элк, Элк — Беласток і двух Чаромха — Беласток і Беласток — Чаромха.

Гэтае рашэнне ўжо амаль пэўнае, хоць, незалежна ад скліканай у гэтай справе ў маршалкоўскай установе прэс-канферэнцыі, не ўсё было ясным. Чыноўнікі падрыхтавалі ўжо спісак спалучэнняў да ліквідацыі ды тых, курсіраванне якіх мае быць абмежаванае або адтэрмінаванае. Аднак, у момант канферэнцыі, прадстаўнікі чыгункі прымалі ўдзел у тэлеканферэнцыі з прадстаўнікамі варшаўскай дырэкцыі ПКП. Як пазней аказалася, рашэнне адтэрмінавалі да 15 ліпеня, значыць, да дня назначэння ўрадам віцэ-міністра інфраструктуры па справах чыгункі. Праз пару дзён, аднак, Рэгіянальная дырэкцыя ПКП у Беластоку пацвердзіла раней прадбачаныя змены, у рамках якіх будзе абмежавана дванаццаць курсаў. Справа ў цягніках, якія давозяць моладзь у школы на час канікул, субот і нядзель, і ў некаторых, што курсіравалі таксама і ў суботы ды нядзелі. Будуць ліквідаваны вячэрнія спалучэнні Беласток — Чаромха і Чаромха — Беласток, ад'язджаючыя адпаведна ў $20^{23}$ і $19^{46}$. Абмежаванні будуць датычыць спалучэнняў м.інш. на шляхах Беласток — Кузніца-Беластоцкая ($14^{43}$), Гайнаўка — Седльцы ($5^{10}$) ды Гайнаўка — Седльцы ($11^{02}$).

— Дзяржаўны бюджэт не спраўляецца з тым, што было прадпасылкай пры спробе ўвядзення ў жыццё рэструктурызацыі і мадэрнізацыі ПКП. Не рэкампенсуе ў прадбачанай ступені перавозаў, — гаварыў на пачатку ліпеня Чэслаў Суліма, намеснік дырэктара Падляшскага прадпрыемства рэгіянальных перавозаў ПКП у Беластоку. — Усё няма адказу, ці ПКП мае быць надалей калектыўным перавозчыкам, ці трэба яму прыватызавацца. Ёсць недахопы ў спраўнай транспартнай палітыцы ў Падляшскім ваяводстве. Можа, варта інтэграваць чыгуначныя спалучэнні з аўтобуснымі.

Пакуль што, цяжка гаварыць аб апошняй ідэі, паколькі прэм'ер Лешак Мілер на найбліжэйшы час паведаміў аб пачатку прыватызацыі ПКС. Суцяшае тое, што ПКП прыняла пад увагу пастулаты старостваў у Гайнаўцы і Сямятычах і будзе ўтрымана адно непасрэднае спалучэнне Гайнаўка — Варшава. Гэтыя цягнікі будуць ездзіць штодзень апроч суботаў.

Тым часам 27 ліпеня з Беластока рушыць у спробнае, паказное падарожжа адначленны, сучасны рэйкавы аўтобус „Трамп”, які з будучага года будзе курсіраваць на шляху Беласток — Чаромха. У нашым рэгіёне праездзіца ён па пуцях Беласток — Бельск-Падляшскі — Чаромха — Гайнаўка.

(холм)

Міхалоўская гміна

# Што новага?

Зараз у Міхалове шмат робяць дзеля таго, каб насельніцтву жылося лепш. Адрамантавалі вясковы клуб у Тапалянах і аднавілі базарную плошчу ў Міхалове, а таксама навялі парадак у мястэчковым парку.

Працаўнікі Прадпрыемства камунальнай і жыллёвай гаспадаркі пракладаюць тратуары ў Новай Волі, возяць жвір на дарогі ў Тапалянах, Гозьнай, Цiванюках і Таніцы.

Цяпер кладуць асфальт па вуліцы Лясной у Міхалове і будуюць дарогу на кааператыўным пасёлку ў Бандарах. Распачаліся працы пры добраўпарадкаванні парку ў Ялоўцы ды пераабсталяванні пляжа ў Бандарах.

(яц)

# Працяг вайны ў Саюзе палякаў Беларусі

Пасля гарачых вясновых баталій з галадоўкай і кароткага „зацішша" ў гродзенскай сядзібе Саюза палякаў Беларусі (СПБ) назіраецца новы віток канфрантацыі. Як і чакалася, цяперашні старшыня СПБ Тадэвуш Кручкоўскі імкнецца ўсімі сродкамі пазбыцца сваіх апанентаў, якія абвінавачваюць яго ў наўмысным парушэнні статута арганізацыі і сумнеўных фінансавых махінацыях.

Зважаючы на свой „статус незаконна пакрыўджаных", бяздзейнасць праваахоўных органаў, нахабнае ігнараванне спадаром Кручкоўскім пастаноў суда Ленінскага раёна Гродна і Абласнога гаспадарчага суда, сябры СПБ Здзіслаў Богуш і Зыгмунт Пелуць вырашылі апеляваць праз журналістаў да шырокай беларускай і польскай грамадскасці. З гэтай нагоды яны 26 чэрвеня ў галоўнай сядзібе СПБ правялі адмысловую прэс-канферэнцыю.

Даведаўшыся пра намер сваіх апанентаў, спадар Кручкоўскі аддаў загад нікога не пускаць у будынак СПБ, а сам паспешліва рэціраваўся, каб не сустракацца з прадстаўнікамі СМІ. Але сустрэча з журналістамі ўсё ж адбылася. Спадары Богуш і Пелуць расказалі пра факты парушэння ў СПБ заканадаўства і паказалі адпаведныя дакументы. Так, Здзіслаў Богуш, адміністратар сядзібы СПБ у Гродне, які да таго ж працаваў і шафёрам у Саюзе, быў (у парушэнне працоўнага заканадаўства Рэспублікі Беларусь) звольнены загадам старшыні Кручкоўскага 3 красавіка г.г. Матывацыя — скарачэнне пасады з-за недахопу сродкаў.

— Аднак за дзень да гэтага загаду, — паведаміў Здзіслаў Богуш, — Кручкоўскі прыняў на працу замест мяне іншага чалавека. Каб адстаяць свае правы, я вымушаны быў звярнуцца ў суд. І суд Ленінскага раёна Гродна прызнаў маё звальненне незаконным ды паставіў з 16 чэрвеня ўзнавіць мяне на працы. Але Кручкоўскі проста ігнаруе рашэнне суда і пагрозліва заяўляе: „Ты працаваць тут не будзеш!"

Рэч у тым, што спадар Богуш зашмат ведае пра неадназовыя парушэнні ўставу ды існаванні ў Саюзе палякаў Беларусі падвойнай бухгалтэрыі, пра выкарыстанне транспарту не па прызначэнні, асабісты канфлікт старшыні Кручкоўскага з аддзелам адукацыі СПБ. Вельмі цікавымі фактамі пра парушэнні беларускіх законаў кіраўніцтвам Саюза валодае адзін са стваральнікаў гэтай арганізацыі, былы намеснік старшыні СПБ па гаспадарчай дзейнасці і заснавальнік Гандлёва-прамысловай палаты СПБ Зыгмунт Пелуць.

— Сёння можна казаць пра дзесяткі выпадкаў ухіленняў ад падаткаў і незаконным выкарыстанні транспарту Саюза палякаў у чыста камерцыйных мэтах, — сцвярджае спадар Пелуць. — За мяжу за пэўныя сумы грошай вывозіліся людзі, але сродкі ад гэтых тураў не паступалі ані ў Гандлёва-прамысловую палату, ані на дзейнасць СПБ. Старшыня Кручкоўскі нават выхваляўся, што яму толькі на падатках удалося „зэканоміць" 18 000 долараў!

Як адзін з заснавальнікаў Гандлёва-прамысловай палаты СПБ Зыгмунт Пелуць ужо год не можа даведацца: на якія мэты былі скарыстаны гэтыя „заробленыя" сродкі. Старшыня Тадэвуш Кручкоўскі і дырэктар Палаты Людміла Сідо не даюць спадару Пелуцю азнаёміцца з бухгалтэрыяй. Больш за тое, яны імкнуцца яго выключыць са складу заснавальнікаў Палаты. З гэтай мэтай быў з парушэннем заканадаўства сфабрыкаваны пратакол заснавальнікаў Палаты, якія нібыта прынялі рашэнне аб выключэнні спадара Зыгмунта Пелуця з заснавальнікаў гэтай структуры. Гаспадарчы суд Гродзенскай вобласці прызнаў гэты пратакол незаконным, бо яго падпісалі асобы, якія раней самі добраахвотна выйшлі з заснавальнікаў Гандлёва-прамысловай палаты СПБ і не мелі аніякага права прымаць лёсавызначальныя рашэнні. Адметна і тое, што ніхто не панёс аніякай адказнасці за фальсіфікацыю.

Па словах Зыгмунта Пелуця, гродзенская пракуратура і міліцыя валодаюць інфармацыяй пра існаванне падвойнай бухгалтэрыі ў СПБ ды іншых парушэннях заканадаўства, але дагэтуль не прымаюць дзейсных мераў. Рэч у тым, што дырэктарка Гандлёва-прамысловай палаты СПБ Людміла Сідо з'яўляецца жонкай Уладзіміра Сідо — начальніка аддзела па барацьбе з арганізаванай злачыннасцю і карупцыяй Гродзенскай абласной пракуратуры. Гэта шмат у чым тлумачыць дзіўную пазіцыю пракуратуры ў адносінах да злоўжыванняў спадара Кручкоўскага. Аднак аддзел па барацьбе з эканамічнымі злачынствамі Упраўлення ўнутраных спраў па Гродзенскай вобласці ўжо праводзіць праверку дзейнасці Палаты. Ды, як лічыць спадар Пелуць, улічваючы ўплыў Уладзіміра Сідо, шанцаў на аб'ектыўны разгляд справы вельмі мала. Ён шчыра абураецца:

— Я шмат сілаў і часу ахвяраваў на развіццё Саюза палякаў Беларусі і зараз мне крыўдна і балюча, што справа майго жыцця пераўтвараецца ў „дах" для праваручання сумнеўных фінансавых аперацый ды ўзбагачэння купкі асоб!

Калі гіпатэтычна купка асоб сапраўды імкліва ўзбагачаецца, дык, па словах Здзіслава Богуша, за гады „праўлення" Тадэвуша Кручкоўскага (са снежня 2000 г.) заробак шараговых супрацоўнікаў СПБ не індэксаваўся з улікам інфляцыі і росту коштаў у Беларусі. Больш за тое, старшыня Кручкоўскі сваім загадам № 22 ад 05.05.2003 г. перавёў тых супрацоўнікаў на паўстаўкі з 4-гадзінным працоўным днём. Матывацыя — адсутнасць фінансавання з боку Таварыства Wspólnota Polska. Але галоўны спонсар Саюза палякаў Беларусі сапраўды занепакоены становішчам і скандаламі вакол гэтай арганізацыі. Тым больш, як высветлілася на прэс-канферэнцыі, спадар Кручкоўскі яшчэ не зрабіў для Wspólnoty Polskiej фінансавай справаздачы за мінулы год...

Усе гэтыя скандалы і канфлікты ў СПБ акрамя побытава-крымінальнага маюць яшчэ і палітычны аспект. Напэўна для беларускіх улад „культурна-асветная" дзейнасць старшыні Кручкоўскага і негатыўны розгалас вакол самай масавай грамадскай арганізацыі Беларусі, дзейнасць якой фінансуецца з Польшчы, вельмі зручная. Хаця б у мэтах дыскрэдытацыі polskiego odrodzenia na Kresach Wschodnich напярэдадні ўступлення НАТАўскай Польшчы ў Еўрасаюз.

Ігар Гандлеўскі

**Вачыма паляка**

# Самаўрадавая дэпрэсія

Ужо два разы ўспомніў я ў гэтай рубрыцы аб ездаках на роліках, якія не даюць мне і маім суседзям цэлымі днямі і вечарамі спакою гучнымі падскокамі пад маімі вокнамі, а і па ўнутранай часткі вуліцы, па якой што і раз праязджаюць машыны. Урэшце ўзяўся я змагацца. Спрабаваў найперш са скакунамі паразмаўляць. — Spadaj pan, — пачуў. Дык „спаў". Пайшоў у камісарыят. Паліцыянты сказалі з амаль дзіцячай наіўнасцю: „А што мы можам? Не перашкаджаюць у «начной цішыні». — „Ну, але ж яны — пагроза для шафёраў, і наадварот". — „Не паставім жа ж на кожным рагу вуліцы паліцыянта!"

І так закончылася мая інтэрвенцыя ў старажаў парадку. Не засталося мне нішто іншае, як звярнуцца з просьбай у раду пасёлка, у тое самае падставовае прадстаўніцтва лакальнага грамадства. Прынамсі такім мела быць, калі з ініцыятывай іх стварэння ў выбарах на пачатку дзевяностых выступілі гарадскія ўлады таксама і Беластока. Значыць, напісаў я адпаведную цыдулу. Падпісаліся пад ёй усе суседзі, сярод іх і пані Ядвіга, якая дзейнічае ў падобнай да самаўрадавай радзе пасёлка, толькі што пры маім жыллёвым кааператыве. І яна паставіла свой подпіс і запыталася: „А куды вы з гэтым пойдзеце?" — „Як гэта — куды? Да старшыні самаўрадавай рады. Яны ж дзеля гэтага і выбраны. У мясной краме вісіць аб'ява, калі і куды ісці з прапановамі". Пані Ядвіга спакойна прыкурыла цыгарэту і стала мне тлумачыць, што маёй самаўрадавай рады пасёлка, як і іншых у Беластоку, фактычна няма. Ужо даўно кончыліся яе паўнамоцтвы, а новых выбараў улада не аб'явіла.

Значыць, што калі нават старшыня, той, што чакае прапаноў, згодна з аб'явай на мясной краме, і нават прымае наведвальнікаў, дык толькі як прыватная асоба, без мандата майго лакальнага грамадства.

Развёў я рукамі. Нічога не мог я зрабіць, як, мабыць, толькі пачаць пертрактацыі з бацькамі ролікаўцаў. А ўжо чую: „Адчапіся, пан" у абароне сваіх „пацех", якія мусяць праводзіць канікулы ў горадзе, бо бацькі не маюць грошай на тое, каб кудысьці іх выслаць у адпачынак.

Пры нагодзе пачаў я задумвацца: як гэта так, што кіруючыя горадам не аб'явілі новых выбараў у пасёлкавыя рады. Недагляд? Навала іншых праблем для развязкі? Здалося мне гэта нейкім абсурдам. Паразмаўляў я на гэту тэму з журналістамі іншых лакальных газет. Пачуў: Гарадскія ўлады не ведаюць, што з гэтым рабіць. Кіруючая горадам правіца хацела б „абсадзіць" гэтыя рады сваімі. А, як відаць пасля апошніх выбараў, запанавалі ў большасці левыя настроі. Рады быццам бы дзейнічаюць на грамадскіх пачатках, ды трэба было б тых пару тысяч перадаваць на грамадскія патрэбы. Практыка, аднак, паказала, што ў шмат якіх выпадках невядома, куды тыя грошы дзеліся. Бо калі хтосьці ў пасёлках штосьці робіць, дык хутчэй кааператыўныя рады, а не самаўрадавыя. Мабыць, за грошы з гарадской касы, некаторыя ў пасёлкавых радах самі імі карысталіся.

Нават калі гэта і праўда, а нават калі і не, дык застаецца пытанне: да каго маем я са сваімі суседзямі звярнуцца ў справе ролікаўцаў? Пэўна ж не непасрэдна да гарадскіх радных, якім вочы звесці не даюць невядома чаму непадрыхтаваныя прэзідэнтам горада і яго прадстаўнікамі прасторавыя планы добраўпарадкавання Беластока, дзякуючы якім, можа і праз гадоў дзвацаць, дзесьці ў ваколіцы маглі б узнікнуць спакойныя месцы для аматараў язды на роліках.

Мушу, значыць, выслухоўваць бесперапынны стукат падскокваючых малалеткаў, а да таго адчуваю сябе пакінутым пасёлкавай і гарадской уладамі. Вера ў самаўрад ува мне ніяк не патухае, бо ж першапачатковая іх ідэя была вялікая. Пачакаю, пэўна, наступных выбараў, ужо ў Еўрасаюзе. Тым часам, хоць спёка, зачыняю ды завешваю ўсе вокны, не адчыняю нікому дзвярэй... Поўная дэпрэсія.

Мацей Халадоўскі

# Да юбілею мовазнаўца




6 лістапада будзе 120 гадоў з дня нараджэння Язэпа Лёсіка. Таварыства беларускай мовы імя Францішка Скарыны распачало ўшанаванне памяці празаіка, публіцыста, мовазнаўца, літаратуразнаўца і палітычнага дзеяча выданнем кішэннага каляндарыка на 2003-2004 гг. Выкарыстана фота Язэпа Лёсіка 1930-х гадоў з сямейнага архіва дачкі Алесі Лёсік. На другім плане — будынак педагагічнага тэхнікума ў Менску (1925 г.), вокладкі вучэбных дапаможнікаў па беларускай мове, лагатып газеты „Беларусь", якую ён рэдагаваў, гады жыцця (1883-1940) ды сімволіка ТБМ. Дызайн выканаў мастак Ігар Марачкін. З удзелам Таварыства рыхтуецца да друку кніга твораў Язэпа Лёсіка.

Ірына Ляксеева

# З галоўным прызам



Фота Аляксея Мароза

Барбара Якубюк у сваім агародчыку

Барбара Якубюк, вучаніца Комплексу школ з дадатковым навучаннем беларускай мовы ў Гайнаўцы, прымала ўдзел у конкурсе арганізаваным у рамках праекта „У Еўропе аднолькавых шанцаў”. У штотыднёвай жараб'ёўцы выйграла яна кніжную ўзнагароду, а ў завяршальнай — галоўны прыз: набор дапаможнікаў для вывучэння англійскай мовы.

„Ніву” Барбара купляе з першага класа белгімназіі (зараз закончыла вучобу ў гімназіі і паступіла ў Гайнаўскі белліцэй) і найчасцей чытае артыкулы ў „Зорцы”.

— Найахвотней чытаю артыкулы, якія дасылаюць у „Ніву” мае сяброўкі. Люблю чытаць тэксты пра Гайнаўку і нашу школу. Цікаўлюся інфармацыямі пра спартыўныя поспехі нашых вучняў, — інфармуе Барбара. Артыкулы напісаныя ў рамках праекта „У Еўропе аднолькавых шанцаў” пачала чытаць, бо цікавіцца Еўропай і краінамі, якія ўваходзяць у Еўрасаюз.

— Чытала я кожны другі нумар „Нівы”, бо зрабіла падпіску на яе разам з сяброўкай. Спачатку не верыла, што магу нешта выйграць. Калі перамагла ў першым этапе і атрымала кніжную ўзнагароду то паверыла, што магу выйграць галоўны прыз. Дагэтуль вывучала я нямецкую мову, але ад верасня пачну вучыцца англійскай мове. Набор дапаможнікаў для вучобы гэтай мове буду магла выкарыстаць у час працы з камп'ютэрам, які плануем купіць праз месяц, — кажа ўзрадаваная Бася.

Піша яна вершы на польскай і беларускай мовах. Атрымала вылучэнне ў VII выпуску Конкурсу беларускай паэзіі і прозы арганізаванага нашым тыднёвікам. У завяршальным класе белгімназіі атрымала сярэднюю ацэнку 4,5 і кніжную ўзнагароду. Любіць фатаграфаваць, хадзіць на шпацыры і займацца на прыродзе.

— Паступіла я ў Беларускі ліцэй, бо там высокі ўзровень навучання. Падабаецца мне таксама выгляд школы. У будучыні хацела б вучыцца на фармакалагічным факультэце, а пасля выехаць на працу ў Нямеччыну, — гаворыць Бася.

Аляксей Мароз

# Суседзі ведаюць нашу мову. А мы?

Сёлета ўдзельнікі IX Алімпіяды беларускай мовы — вучні Гайнаўскага і Бельскага беларускіх ліцэяў — ва ўзнагароду пабывалі ў Мінску. А вось што пра знаходжанне нашых „алімпійцаў” у сталіцы Беларусі напісала газета „Звязда”.

Лілася беларуская гаворка. Калі б чалавек непаінфармаваны днямі трапіў у сталічны Дом дружбы, парадаваўся б: як хораша падлеткі гавораць па-беларуску. Але... справа ў тым, што гэтыя хлопцы і дзяўчаты завіталі ў нашу краіну з Польшчы.

Вядомыя беларускія пісьменнікі, прадстаўнікі розных міністэрстваў і грамадскіх арганізацый, пасол Рэспублікі Польшча — усе гэтыя людзі днямі сабраліся ў Доме дружбы, каб павіншаваць пераможцаў усяпольскай алімпіяды па беларускай мове. Гэтаму навуковаму спаборніцтву польскіх школьнікаў надаецца асаблівы сэнс. Як было адзначана на ўрачыстым мерапрыемстве, людзі, якія вывучаюць замежную мову, генетычна цягнуцца да яе носьбітаў. Акрамя таго, мы — суседзі, і многія польскія дзеячы культуры нарадзіліся ў Беларусі.

Вызначэнне лепшых знаўцаў беларускай мовы сярод польскіх школьнікаў праводзіцца ўжо 9-ы раз. Уяўляеце, колькі новых сяброў з'явілася ў нашай краіны! І не выпадкова ўручэнне прызоў пераможцам конкурсу праводзіцца ў Мінску. Усё ж госці могуць і краіну пабачыць, і з равеснікамі пазнаёміцца. Так, сёлета каля 20 юных палякаў пабывалі ў мінскіх гімназіях, з'ездзілі на экскурсію ў Заслаўе.

Між іншым, каб перамагчы ў алімпіядзе, польскім школьнікам мала было проста ведаць нашу мову. Яны пісалі работу па фальклору, знаёміліся з беларускай літаратурай.

„Я думаю, што гэта добра, валодаць як мага большай колькасцю замежных моў. Беларусь жа мяжуе з Польшчай, і я адчувала, што веданне мовы суседзяў мне можа спатрэбіцца. Таму з двух ліцэяў, якія ёсць у маім горадзе, абрала беларускі, — прызналася пераможца ўсяпольскай алімпіяды Эмілія Пліс. — Ды і ўдзельнічаць у алімпіядзе было даволі цікава, мы паглыбіліся ў літаратуру, пазналі шмат новага”...

Хочацца верыць, што такія алімпіяды будуць спрыяць не толькі наладжванню добрасуседскіх адносінаў, але і даваць штуршок для таго, каб у нашай краіне часцей гучала беларуская мова. Магчыма, хтосьці з нашых суайчыннікаў, пачуўшы, як госці з Польшчы размаўляюць па-беларуску, здзівіцца і задумаецца: „А хіба мы, беларусы, не можам так размаўляць на сваёй мове?!”.

Алена Вайцяховіч
„Звязда”, № 145-146
ад 13 чэрвеня 2003 г.



# Кірмаш на Яна

*За асаблівым дазволам юрысдыкцыйнае звярхнасці Іхнай мосці Яна Клемэнса Браніцкага, у нядзелю, гэта, значыцца 15 чэрвеня 2003 году даны будзе за справай Аддзелу этнаграфіі Падляшскага музея ў Беластоку і Аддзелу згуртавання народных творцаў у Беластоку, з каралеўскай прывілеі данай году Панскага 1749, стараннем Ягамосці Пана Яна Клемэнса Браніцкага, кракаўскага кашталяна, гетмана вялікага каронага, Ордэнаў Залатога Руна, св. Андрэя і Белага Арла кавалера, старасты багуслаўскага, кросненскага, мосціцкага, бельскага etc.* адбыўся Кірмаш на Яна. Расклад яго быў наступны: прыбылыя з акалічных сёлаў рукадзельнікі выставілі для продажу свае вырабы: граблі, рэшаты, касільны, колы і драўляныя вазы, кошыкі з саломы, лазы, дзёрты з драўніны ды кораня, ганчарскі і бондарскі посуд, традыцыйныя кавальскія вырабы, двухасноўныя ды іншыя тканіны, саламяныя маты etc. Чыненыя былі: тачэнні посуду на ганчарскім коле, пляценне начыння з саломы, выкоўванне падкоў etc. Бавіла для пацехі мяшчан капэла KONTRO з Сямятыч, капэла з Плонкі-Касцельнай. Атракцыі: падляшскія мяды, традыцыйныя вясковыя хлябы etc. А атракцыі іншыя: саламяныя капелюшы з Чанстахова, „амерыканская аўтамата для вязання кравата” і гэтак далей, і да гэтага падобнае.

Больш за 70 народных умельцаў прэзентавалі свае выбары на святаянаўскім кірмашы пад беластоцкай ратушай. Можна было купіць і граблі, і яшчэ гарачыя падковы, і смачнае печыва, мёд ды трускалкі. Як на пікніку — традыцыйна прыходзяць цэлыя сем'і — бабуля купіць гладышку, унук ледзянца, мама вышываны абрус ці сурвэткі, дзед пацікавіцца коўкай, бацька — кошыкамі... Пані Марына з вуліцы Ажэшкі доўга падбірала рэшаты ды сіты, унучка цягнула яе да драўляных вырабаў спадарства Тарасевічаў з Гайнаўкі, родам з Пасек Нараўчанскай гміны. Тарасевічы робяць вядомы на Падляшшы драўляны посуд з бярозы. Сёлета запрапанаваў ім этнограф з Падляшскага музея Войцех Кавальчук (ён жа адкрыў быў спадчыну славутага фатографа з Лукі Якуба Смольскага), каб пашырылі сваю прапанову, і на двух сталах паявіліся м.інш. бэйцаваны светлым арэхам тачаны посуд, пасвісцёлы — коцікі і птушкі ды іншае, што цікавіла пакупнікоў. Спадарства Тарасевічы бываюць на кожным такім кірмашы на Падляшшы, і маюць ужо сваіх верных пакупнікоў.

Найбольшыя чэргі былі да салодкага — сярод вырабаў паявіліся вялікія цукровыя кветкі. Дзеці і моладзь не памятаюць колішняга кірмашу на Яна, арганізаванага калісьці на Бэма, на Сяным рынку. Тады цэнтр Беластока быў заstaўлены вазамі, кашолкамі, бочкамі, маслабойкамі... Толькі здымкі засталіся з таго часу і ўспамін жывога Беластока.

(лук)

# Веласіпед за макулатуру

У час заканчэння навучальнага года ў Комплексе школ у Чыжах, якое адбылося 20 чэрвеня 2003 года, войт Чыжоўскай гміны Юрый Васілюк уручыў узнагароды пераможцам конкурсу збірання адкідаў, арганізаванага гміннымі ўладамі. Пераможца, Радаслаў Пашкоўскі з Гімназіі ў Чыжах, атрымаў з рук войта новы веласіпед. Другое месца заняла Данеля Філіманюк, а трэцяе Адрыян Клім (абое з Падставовай школы ў Чыжах), якія атрымалі па палатцы. Іншыя ўзнагароджаныя атрымалі спальныя мяшкі, футбольныя мячы і спартыўныя прылады.

Да конкурсу прыступіла пад 100 вучняў Комплексу школ у Чыжах і Падставовай школы ў Кленіках. Вучні, якім працаўнікі гміннай управы раздалі фольгавыя мяшкі, збіралі макулатуру, пластмасавыя і шкляныя бутэлькі ў сваіх суседзяў і знаёмых. Апрача конкурсу гмінныя ўлады рашыліся ліквідаваць нелегальныя звалкі смецця і з гэтай мэтай па вёсках расставілі ўмяшчальнікі на шкло і пластмасавыя бутэлькі. Легальная звалка смецця знаходзіцца каля Чыжоў і туды трэба прывозіць адкіды з тэрыторыі ўсёй Чыжоўскай гміны.

— Усе гэтыя ініцыятывы маглі адбыцца, дзякуючы нашаму супрацоўніцтву са спонсарам узнагарод — Саюзам Green Way з Беластока, які забярэ сабраныя адкіды, — паінфармавала інспектар Анна Васылюк, адказная за збіранне адкідаў і арганізацыю конкурсу.

— Дзякуючы супрацоўніцтву з Саюзам Green Way, можам разлічваць на дапамогу ў экалагічных інвестыцыях, — заявіў войт Юрый Васілюк. — У наступным годзе плануем будову ачышчальні сцёкаў і кожная дапамога нам патрэбная. Зараз прапануюць нам дафінансаванне гэтай інвестыцыі ў памеры 30%, што нас не задавальняе. У такім выпадку мусілі б мы вельмі задоўжыцца. Плануем шукаць дадатковага фінансавання.

У гэтым годзе ў Чыжоўскай гміне закончылася мадэрнізацыя дарогі Лушчы — Курашава, якую асфальтавалі. Праз месяц павятовыя ўлады плануюць распачаць мадэрнізацыю дарогі Чыжы — Падрэчаны, якая таксама будзе асфальтавана. Зараз завяршаецца будова водаправодаў на хутарах Койлаў і Курашава.

Аляксей Мароз

Зорка
старонка для дзяцей


Фота ГАННЫ КАНДРАЦЮК

# Лебедзь „Квачык” у кашулі „Зорка”

Атрымалі першае месца і дзве індывідуальныя ўзнагароды! Прызы заваяваў, як і ў мінулым годзе, тэатральны калектыў з Беластока пад кірункам Аліны Ваўранюк. Ідзе пра малодшых аматараў беларускага тэатра з ПШ н-р 4. Падрыхтавалі яны „Брыдкае качаня”. У аснову сцэнарыя паслужыла агульнавядомая казка Ханса Крыстыяна Андэрсена, перапрацаваная спадарствам Войцікамі на сучасна-жартаўлівы лад і перакладзена з польскай на беларускую мову настаўніцай.

Сцэна адбываецца на вясковым панадворку. Героі — гэта хатнія птушкі: куры, гусі, індыкі, качкі. Ёсць таксама паўлін-фарсун і сарокі-пляткаркі. „Певень” гаспадар і арганізатар панадворка (цудоўная роля Мацея Карчэўскага) і яго жонка-пляткарка „Кура” (індывідуальная ўзнагарода для Наталлі Кандрацюк-Свярубскай) арганізуюць штодзённы настрой панадворка. Жанчыны-птушкі, як прыстоіць гэтаму роду, снуюць інтрыгі, пляткуюць, сварацца. Між „бабамі” запутаўся іх верны фан-фарсун — „Паўлін” (класная роля Матэвуша Севастыяніка) і непаседлівыя сарокі (Оля Максімюк і Магда Саковіч). Мужчыны трымаюцца збоку і больш дзелавіта ўспрымаюць апошнюю навіну. Менавіта, на іх панадворку нарадзілася небывалая паскуда. Брыдкае качаннё! Адны бацькі — „Качка” і яе муж (Оля Більмін і Тамаш Максімюк) бароняць непрыгожае дзіцянё. Аднак жарсці на панадворку перасякаюць межы ўсякай акуратнасці — „Кура” дзярэцца з „Індычкай” (індывідуальная ўзнагарода для Олі Каліны). „Квачык” — брыдкае качаня, ідзе ў свет. Яго рашэнне настолькі абыякавае птушкам, што яны нават не заўважаюць роспачы бацькоў і адкінутага дзіцяці. Толькі пасля лета, калі вярнецца пад выглядам лебедзя, птушкі пазнаюць у ім па голасе свайго „Квачыка”. Настрой варожасці цудоўна пераменіцца ў захапленне і любоў.

„Лебедзь” (Ганка Пякарская) вяртаецца на панадворак у кашульцы з надпісам „Зорка”. (Мы ў захапленні!)

Трэба адзначыць, што ўсе акцёры-птушкі вылучаліся простымі, аднак вынаходлівымі касцюмамі. Яны выступалі ў рознакаляровых „тышэртах”, „легінсах”, басанож.

Спектакль „Брыдкае качаня” быў пераплецены прыгожымі песнямі.

Зорка

## Вершы Віктара Шведа

### Летні адпачынак

*Працавалі ў школе, дома,*
*Вельмі многа і няспынна*
*І патрэбны ўжо, вядома,*
*Нам даўжэйшы адпачынак.*

*Пад блакітным летнім небам,*
*На прыроды дараваннях,*
*Аднавіць нам сілы трэба,*
*Што патрацілі ў змаганнях.*

*Да айчыннае прасторы,*
*Поўнай чыстага паветра,*
*Вабяць мора, рэкі, горы,*
*Вабяць нас лясныя нетры.*

*З новай сілай, з новай марай*
*І з уздымам новым, гартам,*
*З летнім сонечным загарам*
*Сядзем зноў за школьнай партай.*

Авяр'ян Дзеружынскі

### Лісічкі

*Любяць хованкі*
*Лісічкі...*
*Пазалазяць*
*Маладзічкі*
*Пад хваінкі,*
*Пад іглінкі,*
*Пад танклявыя галінкі*
*Ды лістамі*
*Ўкрыюцца,*
*У імхі*
*Зашыюцца...*

*Хітрыя*
*Лісічкі,*
*Хоць*
*І невялічкі.*

Ніна Мацяш

### Валасянкі

*Зноў на флейце ад самага ранку*
*Грае ў садзе маім валасянка.*

*Ёй сяброўка захоплена ўторуе, —*
*Мо рыхтуюцца ў кансерваторыю?*

Валасянкі (Sylvia) — пеўчыя птушкі сям'і валасянковых, атр. вераб'інападобных.

# Рамонкі

Стаяць амаль у полі новыя жыллёвыя блёкі. Крыху адрозніваюцца яны ад тыповых прамавугольнікаў, якія ставілі ў горадзе пару дзесяткаў гадоў таму, шэрых, без дахаў, з пушачкамі балконаў. Гэтыя шматпавярховыя дамы нават і каляровыя, і дашкі над усімі імі звісаюць з чырвонае бляхі, і балконы з жалезнымі каванымі бар'ерамі, і кветак шмат на іх... Ды ўсё ж — пустыня, хоць людзей як мурашак у мурашніку. Людзі наўкол пасадзілі кволыя дрэўцы і кусты. А колькі ж трэба часу, пакуль дрэва вырасце! Хлопчыкі ў мяч гуляюць, стукне які ў ствол рабінкі, клёна ці ліпкі, зломіць... Рабочыя зноў раскопваюць толькі што выраслую траву, бо штосьці кепска паклалі ў зямлі, вывалакаюць нейкія кабелі, трубы, зноў завальваюць грудамі перавернутай глебы... Традыцыя! — кажа Ясеў дзед Ігнат. Што за традыцыя, толькі ён ведае. Традыцыя непарадку і працы „абы-як”?

Як бы там ды чаго не садзілі ці сеялі, усё марна расце. Ды рамонкі трымаюцца нават на сухой гліне. Тая ніва залацiста-белых рамонкаў — адна асалода для дзяцей ды пчол. Сярод рамонкаў пратаптаны сцежкі. Не простыя, хоць, як тлумачыць дзед Ігнат, вельмі лагічныя. Тыя, вырысаваныя архітэктарам, абложаныя плітамі, не заўсёды паважаюцца жыхарамі, хоць роўныя і таксама вядуць да мэты. Пешаходы ведаюць лепш, — смяюцца Ясь і дзед Ігнат, тэпаючы ў краму ці ў пасёлкавы клуб. Бо на новых пасёлках — усё новае, каб жылося лепш. Як зусім новы гарадок — са сваёй школай, поштай... Толькі не ў кожным мікрараёне — столькі рамонкаў, у якіх гудуць пчолы.

Раніцай дзед Ігнат вярнуўся з крамы. Паставіў торбу з малаком ды булачкамі ў кухні на стале ды закурыў. Дзед Ігнат ніколі не курыў у хаце. Папраўдзе, увогуле кінуў быў гэту шкодную звычку, хоць пачак цыгарэт носіць яшчэ ў кішэні. Знерваваўся, вось, запаліў. Ясь босымі нагамі прышлэпаў на кухню, зморшчыў нос ад непрыемнага дыму.

— Прабач, унучак, што смалю, — уздыхнуў дзед Ігнат. — Акно адчыню. Глянь, што робіцца. От, пляга.

Пад блёкамі завіхаліся касцы. Роўна размахваючы косамі, ішлі наперад. За імі ніцма ляжала скошанае поле непакорных рамонкаў.

Міра Лукша

# Еўрапейская свядомасць у арлянскай школе

**15 мая г.г. у Комплексе школ у Орлі адбылося ўрачыстае адкрыццё Клуба малога еўрапейца. Ва ўрачыстасці прынялі ўдзел вучні пачатковай школы і настаўнікі з дырэкцыяй. Перад публікай з мастацкай часткай на польскай і беларускай мовах выступілі сябры Клуба.**

На ўрачыстую інаўгурацыю Клуба вучні падрыхтавалі багатую і цікавую мастацкую праграму. Першая частка „Наша айчына, наша мова” была прысвечана шанаванню сваіх традыцый, абрадаў і мовы, бо тады і нас будуць шанаваць у Еўропе. Частка другая „Вітайце ў Еўропе” мела вясёлы, жартаўлівы характар. У ёй вучні прадставілі цікавінкі з чатырох еўрапейскіх краін: Грэцыі, Італіі, Францыі і Вялікабрытаніі. На сцэне выступілі м.інш. грэчаскія багі, парыжскі Гаўрош, сіцілійская мафія і шатландзец у спадніцы. Пасля выступленняў найактыўнейшыя члены Клуба атрымалі ўзнагароды за ўдзел у конкурсах і дзейнасць у Клубе.

Пасля ахвотныя мелі магчымасць пасмакаваць еўрапейскія ласункі, м.інш. венскі тварожнік, кекс, французскае пячэнне, нямецкі яблычнік і наш сукач. Можна было таксама пачаставацца англійскім чаем і італьянскай кавай.

Школьны Клуб малога еўрапейца быў заснаваны восенню мінулага года. У яго працах удзельнічае пятнаццаць вучняў з IV-VI класаў Пачатковай школы. Поўную дзейнасць Клуб разгарнуў у другім паўгоддзі. Дырэкцыя школы адвяла на дзейнасць клуба адну з залаў і дапамагла яе абсталяваць. Заняткі ў Клубе адбываюцца ў чацвяргі, а кіруюць імі настаўніцы Іаланта Зофія Ляўчук, Галіна Рошчанка і Бэата Гарадэцка. Усе сябры Клуба ўдзельнічалі ў некалькідзённых курсах на еўрасаюзныя тэмы.



*Апякунка Клуба Іаланта Ляўчук*

* * *

— Якія мэты ставіць перад сабою Клуб? — з гэтым пытаннем я звярнуўся да настаўніцы Іаланты Ляўчук.

— У дакладзе Еўракамісіі з 1988 года ўпершыню былі выразна акрэслены супольныя адукацыйныя арыенціры краін еўрапейскай супольнасці. Сярод іх было і мацаванне сярод моладзі пачуцця еўрапейскага адзінства, яго каштоўнасцей і найважнейшых дасягненняў у галіне дэмакратыі, правасуддзя і пашаны правоў чалавека, пашырэнне ведаў пра гісторыю, культуру, эканоміку і жыццё грамадзян Еўрапейскага Саюза. На гэтыя мэты і накіроўваем нашу праеўрапейскую дзейнасць у школе.

— Чаго чакаеце ад вучняў?

— Хочам, каб нашы дзеці атрымалі багатыя веды пра сваю Айчыну і ганарыліся ёю. Але, паралельна, каб былі талерантнымі і прыязнымі да іншых народаў. У дзейнасці нашага Клуба кіруемся ідэяй, што сапраўды аб’яднаная Еўропа ўзнікне толькі тады, калі ў маладым пакаленні расцвіце еўрапейская свядомасць і калі маладыя людзі асэнсуюць, што ў Еўропе больш нас яднае, а што дзеліць.

— А што на працягу гэтага паўгода Вы зрабілі?

— Многа часу прысвяцілі мы абсталяванню клубнай залы. На занятках дзеці выпрацавалі клубныя гімн і эмблему ды самі вырашылі, каб клуб называўся Клубам малога еўрапейца. Заняткі ў клубе вядуцца актыўнымі метадамі: гульні, забавы, конкурсы звязаныя з еўрапейскай тэматыкай. Вучні збіраюць матэрыялы пра помнікі мінуўшчыны і прыроды, пра цікавыя месцы ў Еўропе. Пазнаюць звычаі, напрыклад, велікодныя, дзяржаўныя сцягі, песні, стравы і г.д.

* * *

А што кажуць пра Клуб самі вучні?

Рафал Вайцюк (VI кл.): Люблю ўдзельнічаць у клубных занятках, бо яны цікавыя. Удзельнічаем у конкурсах, забавах і даведваемся многа цікавых звестак пра еўрапейскія краіны.

Андрэй Шаранос (VI кл.): Люблю ўдзельнічаць у інсцэнізацыях, выступаць, здабываць новыя веды.

Андрэй Жужаль (VI кл.): У Клубе не маркотна, даведваюся пра такія справы, пра якіх на ўроках не вучымся. Клуб патрэбны, бо патрэбны і веды пра тыя краіны, да якіх неўзабаве наша дзяржава далучыцца.



*Андрэй Жужаль*

* * *

14 лютага ў гімназічных класах арлянскай школы быў праведзены рэферэндум пра яднанне з Еўрасаюзам, у якім удзельнічалі 72 вучні. На пытанне: „Ці падтрымліваеш далучэнне Польшчы да Еўрасаюза?” станоўча адказала 37 вучняў, 27 адказала адмоўна, а 8 не мела на гэты конт меркавання.

Міхал Мінцэвіч

Фота са школьнага фонда

# Польска-беларуская крыжаванка № 28

Запоўніце клеткі беларускімі словамі. Адказы (з наклееным кантрольным талонам) на працягу трох тыдняў дашліце ў „Зорку”. Тут разыграем цікавыя ўзнагароды.




**Адказ на крыжаванку н-р 24:** Матацыкл, самалёт, танец, СМІ, арка, ікра. Матор, гама, танга, але, цёця, быт, сук, львіца.

Узнагароды — кніжку „Музыка і чэрці” — выйгралі: **Марцін Александрук** і **Паўліна Тэслюк** з Новага Корніна ды **Пётр Герасімюк** з Арэшкава. Віншуем!

# Паўліна

У час летніх канікул многія з вас наведаюць вёску. А там, вядома, адны індывідуальнасці. Цікавыя тыпы людзей. Дарастаючыя дзеці вельмі метка назіраюць жыццё, пераўноўваюць, вучацца. Вопыт дапамагае ў жыцці.

Вось Паўліна Чурак з Пачатковай школы ў Арэшкаве падрыхтавала казку „Дзед і баба” Кандрата Крапівы. Дэкламатарка даволі натуральна адлюстравала народны гумар і асаблівасць вясковых дыялогаў. Выступленне Паўліны вылучалася тэатральнасцю і многім слухачам у Нараўцы яно спадабалася.

Цікава ці гімназістка карысталася ўзорамі „чалавечых тыпаў” са сваёй вёскі?

Зорка




Фота ГАННЫ КАНДРАЦЮК




Фота ГАННЫ КАНДРАЦЮК

# Арак

У Орлі таленавітыя дэкламатары. Асабліва хлопцы. Вось Арак Шайкоўскі, вучань пятага класа, „шукаў” на сцэне грыбоў (момант улавіў мой фотаапарат). Паводзіны дэкламатара былі настолькі ўнушальнымі, што публіка разам „шукала баравікоў і лісічак”. Арак менавіта падабраў верш Авяр’яна Дзеружынскага „Па грыбы”.

Выступленне дацаніла конкурсная камісія. Арак Шайкоўскі заваяваў другое месца ў цэнтральным конкурсе „Роднае слова”.

Пры нагодзе: канікулы гэта час, калі варта шукаць грыбоў у лесе!

Зорка



Фота ГАННЫ КАНДРАЦЮК

*Спявае ды іграе Слава Васільеў з Мінска. На заднім плане Славамір Раўбэ з Саколкі. З сынам Янам-Якубам — Ян Камінскі (аўтар „Метафізікі правінцыі")*

# У Цісоўцы з „Карткамі"

Разам з трыццатым нумарам літаратурна-мастацкага часопіса „KARTKI", вядомым у літаратурным свеце, выдаваным больш за дзесяць гадоў у Беластоку, на прамоцыю ў родную вёску галоўнага рэдактара Багдана Дудко, „на канец свету", у Цісоўку, прыехаў поўны аўтобус. У дзедавай хаце Багдан, узнагароджаны аніматар культуры, трымае „каварню «На абочыне»". Гэтая выгадная, вясковая драўляная хата з зялёнымі дзвярыма, набітая кнігамі, патыхае творчым духам. Яна заадно і „дом творчасці" — можна сюды прыехаць і працаваць, каму патрэба і ахвота. У вёсцы Цісоўцы ў Міхалоўскай гміне, пад самай беларускай мяжой, праваслаўна-каталіцкай, найчасцей гучыць беларуская, „простая" мова. Тут не толькі да жывёл па-свойму прамаўляюць. Калі прыязджаем з форсам на імпрэзы „Свету на абочыне", дык „старыя" Дудко Ёзік і яго суседзі заўсёды цешацца; як на вяселлі песні тут тутэйшыя пачуеш, і хутка сваім зыркім вокам і чуткім вухам вылавіць можна а то Гандзю, а то Міру, а то прафесара Валодзю (першы раз на імпрэзе, хоць заўсёды ў нумарах „Картак"), а то Аліка (які вярстаў два апошнія нумары часопіса ды дзве кнігі, выдадзеныя „Карткамі" — „Вершы тутэйшыя" Міры Лукшы ды „Апавяданні з-над Нарвы" Мірыслава Грыкі)... Сапраўды, тыя сустрэчы „на канцы свету" — міжнародныя. І тутэйшыя розных нацыянальнасцей тут разважаюць ды цешацца сваёй адрознасцю і супольнасцю, і замежныя аўтары ды аматары прыгожага пісьма. У гэты раз было больш уцехі ды радасці — юбілейнай ды прыяцельскай.

— Забраў я ўсіх, каго мог, — кажа Багдан Дудко, — каб падзякаваць людзям, якія супрацоўнічаюць з „Карткамі". Бо наш часопіс робяць сапраўды „пасіянаты". Мабыць, гэты нумар, як юбілейны, нічым асаблівым не вылучаецца, не прыкладваў я да яго спецыяльнай вагі. „Карткі", што шырока заўважаецца, усе на роўным, някепскім узроўні. Мару аб іх новым графічным выглядзе, новай вёрстцы... Да новага нумара дадалі мы кнігу Кшыштафа Гедройца „Лісты з ніжняга горада". Ніводзін літаратурны часопіс у Польшчы не дадае да свайго нумара кнігі. Гэта дае вялікі шанц на вядомасць асабліва паэтам-пачаткоўцам. Пасля рэцэнзіі на іх кнігі, выдадзеныя ў „Картках", паяўляюцца ў аўтарытэтных выданнях.

Змест найноўшага нумара „Картак" крыху адрозны ад папярэдніх (раней заўважна пераважала паэзія). Цікава прэзентуюцца ў прозе вядомыя паэты Яцак Падсядла і Кшыштаф Сліўка, Моніка Мастовік, Пётр Гедровіч, надрукавана новае апавяданне Міраслава Грыкі „Усё праз тую саланінку". Шмат інтэрв'ю — са Стэфанам Хвінам, Кшыштафам Варгам, мастаком родам з Крынак Міколам Малешам (у галерэі „Картак" — ягоныя карціны); „Карткі" прыдбалі, мабыць, шчасліва, новага аўтара, больш дагэтуль вядомага як журналіста, паэта Пятра Брысача, які, дай Божа, акажацца выдатным набыткам. У гэты раз ён паказваецца як таленавіты, начытаны, дапытлівы размоўца.

Новы нумар „Картак" багаты і на эсэ — Дарыя Кялчэўскага, Яцка Брэчкі, Ярaслава ды Ірынея Сярадзкіх, Марціна Дамінава ды, традыцыйна, прафесара Уладзіміра Паўлючука. З вершаў — цікавыя тэксты Лукаша Шопы (пабач — лацінкай яго творы па-беларуску перакладае Ганна Кандрацюк), Даніцы Паўлёвіч ды Горана Пайкіча з Сербіі і Чарнагорыі ў перакладзе Лукаша Шопы. Аналізуецца ды рэцэнзуецца дзесяць новых кніг, м.інш. Тамары Болдак-Яноўскай, якой новую кнігу прозы запрапанавала чытачам элітнае выдавецтва „Рута".



Фота ГАННЫ КАНДРАЦЮК

*Надрэдактар Багдан Дудко*

Ад „старых", студэнцкіх яшчэ „Картак" яшчэ працягваюцца старонкі гумару і сатыры. Гэта, здаецца, найбольш адрознівае гэты часопіс ад часам смяротна нуднавата-сур'ёзных літаратурна-крытычных часопісаў. Гэта „Chata polska" — „Мастацкі дадатак Таварыства Крэсавай стражы імя Лехніцкіх" ды кайфовыя малюнкі Мета Легуса. Сапраўдная кпіна з набздычаных „каштоўнасцей"! Тут, вось, вам галушка *еўратаўканіцы*:

*Добрую еўратаўканіцу гатуем падобна як традыцыйную з бульбы, г.зн. картоплі якая абсалютна згодная з еўранормамі. Такіх бульбін (абсалютна адна ў адну) не таўчэм, бо ніякая таўкучка ў Еўропе не ёсць вядомай. Укладваем іх, пасля тэрмічнай апрацоўкі ў мікрахвалевай печцы, на народнай пісанай вышыванцы, падлітыя растопеным масміксам. Да таго — чыпсы ў эмалевым збане. Смачна есці!*

Міра Лукша

# Раскіданае гняздо Янкі Купалы

Феномен літаратурнай Лагойшчыны звязаны з асобай Янкі Купалы. Тут, у недалёкім маёнтку Акопы, раскрыўся творчы геній паэта. Купала напісаў тут за 70 вершаў, стварыў свае найважнейшыя драматычныя творы. Самым плённым стаў 1913 год:

— 6 красавіка выйшаў зборнік „Шляхам жыцця",

— 24 чэрвеня ў Акопах закончыў „Бандароўну",

— 2 ліпеня — „Магіла льва",

— 24 ліпеня — паэма „Ён і Яна",

— 31 ліпеня фарс-вадэвіль „Прымакі",

— 4 верасня закончыў „Раскіданае гняздо".

Тры разы ў 1913 годзе была пастаўлена драма „Паўлінка" (27 студзеня — у Вільні, 9 лютага — у Пецярбургу і 15 жніўня — у Радашковічах), якую год раней Купала напісаў у Акопах.

Акопы ў жыцці Янкі Купалы такія ж важныя — як Ясная Паляна для Льва Талстога. Аднак, згодна з беларускай савецкай модай, гэтае культавае месца невядомае і занядбанае.

* * *

Пра нашы змаганні, каб дабрацца ў Акопы можна напісаць драму.

Ужо ў Лагойску нас пачалі ўсімі спосабамі адводзіць ад думкі каб туды ехаць. Па-першае: там нічога няма! Заранае поле, лугі, камень... Па-другое: няма дарогі. Па-трэцяе: наш шафёр забаставаў.

— Ах, какія вы чудакі! — сычэў Саша.

Пані Ніна Пятроўская, у адрозненні ад шафёра, цаніла наш энтузіязм.

— Давайце, пазвонім настаўніку ў Харужанцы, — прыдумала яна, — ён вамі заапякуецца! Калі нельга туды дабрацца на машыне, пойдзеце пешшу.

У Харужанцах, у будынку школы, працуе музейчык у гонар Купалы. Вёска знаходзіцца кіламетры два-тры ад Акопаў.

Мы, вядома, уцешыліся такой магчымасцю, аднак наша шчасце трывала міг. Настаўніка не было ў хаце, музей на час летніх канікул таксама закрыты.

— Ах, какія вы чудакі! — папракаў, ужо лагадней, Саша. — Ведзь там адна сцеп і камні.

* * *

Акопы належалі Луцэвічам з 1909 года. Маці паэта Бянігна Луцэвіч найперш арандавала маёнтак у памешчыцы Жалігоўскай, пасля рэвалюцыі двор перайшоў на ўласнасць сям'і Купалы. Бянігна Луцэвіч жыла тут да 1926 г., пакуль не пераехала ў Мінск, сёстры засталіся ў Акопах да 1929 года. Захавалася мастацкае апісанне месца:

*Сядзіба ў Акопах знаходзілася на пагорку. Чатырма вокнамі і ганкам выходзіла на захад, дзе палеткі ўпіраліся ў лес. На межах стаялі дубы. Падворак з усходу пераходзіў у адхон яра, у лагчыне якога ручай перапынены быў гаццю, што ўтварала сажалку-стаў, дзе на беразе стаяла лазня Луцэвічаў. Над гаццю звешваў кроны векавечны дуб, схіляліся вербы, буяў вербалоз. Правей ад сажалкі рос алешнік, абапал ручая. За ярам стаяў вялізны валун.*

*Дом быў у прысадах, вакол раслі кусты язьміну, шыпшыны. Вокны з пакоя паэта выходзілі на сад. Далей відаць было дубы, елкі, ясені, клёны, сосны з непадалёкага лесу, рабіны, ліпы. Перад хатай стаяла студня з жураўлём. Паблізу размяшчаліся клець, вандлярня, далей — гумно, пуня, хлявы, два свірны.*

* * *

Каб адрэагаваць няўдачу ў Акопах, мы адшукалі ў наваколлі вёску Корань.

— Тут недзе пахаваны бацька Купалы? — пытаем у мясцовых жыхароў. У Корані ведаюць пра магілу Дамініка Луцэвіча. Нас да самой магілы прывяла маладзіца з дзіцяткам на руках. На жаль, на могільніку мы не знайшлі магіл сясцёр і брата паэта, якія паўгода пазней за бацькам памерлі ад шкарлятыны. Трагедыя разыгралася ў 1902 годзе, сям'я арандавала маёнтак у недалёкіх Селішчах. Янка, як найстарэйшы ў сям'і, узяў на плечы абавязкі гаспадара.

У прынцыпе, літаратурны грунт і рамантычны стыль Купалы сфарміраваўся пад уплывам магічнай Лагойшчыны. Паэт ведаў славутых папярэднікаў. Вялікі ўплыў мелі на яго рамантычную эстэтыку доследы і публікацыі графаў Канстанціна і Яўстафія Тышкевічаў.

Купала ведаў спадчыну Зарыяна Даленгі-Хадакоўскага (1784-1825) — славянназнаўца і пачынальніка беларускай фалькларыстыкі, археалогіі, этнаграфіі і дыялекталогіі. Вучоны нарадзіўся ў маёнтку непадалёк вёскі Гайны. Даследаваў старажытныя беларускія архівы, збіраў мясцовую лексіку, археалагічны і этнаграфічны матэрыял.

Родам з Гайны Ігнат Шыдлоўскі (1793-1848) — пісьменнік і перакладчык, выкладчык паэтыкі, рыторыкі і гісторыі літаратуры ў Свіслацкай гімназіі, Віленскім універсітэце. Пераклаў на польскую мову Гарацыя, Н. Буало, Ж. Ж. Русо і іншых. Рэдактар „Tygodnika Wileńskiego". Як вядома, Янка Купала першыя творы напісаў таксама на польскай мове.

* * *

Ёсць яшчэ адна цікавая залежнасць паміж Лагойшчынай і Купалам. Лёс паэта склаўся як расказ-легенда пра вёску і рэчку Гайна. Дзеянне кіруе нас у сівую мінуўшчыну. Сярод лясоў, на яснай паляне бачым малое дзіця. Хлапчук пасвіць авечак. На змярканні не можа далічыцца адной жывёлы. Малы баіцца вяртацца дахаты. У лесе чуе ён голас, здаецца яму, што мякае яго авечка. Дзіця ідзе ў пушчу. Ноччу, калі ўпадзе ад стомы і роспачы, з'ядуць яго ваўкі.

У Акопах захаваўся вялікі валун. Паводле легенды, Купала часта сюды прыходзіў, сядаў на камень і пісаў.

У 1982 годзе да каменя прымацаваны мемарыяльны знак са словамі верша „З кутка жаданняў":

*Песню стварыці ясну як неба*
*У кожнай з ёй хаце мілым быць гасцём.*
*Гэтакіх столькі скарбаў мне трэба.*
*Гэткім я толькі жыву пачуццём.*

Ганна Кандрацюк

# Памінальны май



*Над магілай Гасана Канапацкага. Злева: імам Рафал Бергер і Мацей Канапацкі*

### Гасан Канапацкі

Для гданьскіх беларусаў май атрымаўся памінальны. Якраз 11 мая адзначаліся 50-я ўгодкі смерці Гасана Канапацкага, бацькі нашых сяброў Мацея і Тамары. Пахаваны ён на могілках у Быдгашчы. Паколькі быў гэта вядомы дзеяч беларускага руху міжваеннага перыяду, пра якога якраз 10 гадоў таму я напісала ў „Ніву”, хацелася пабачыць як захоўваецца ягоная магіла. Зараз апякуецца ёю быдгаскі імам Рафал Бергер. Ён і сустрэў нас у Быдгашчы і правёў ад чыгуначнай станцыі праз Стары Горад на могілкі. Мацей спярша зайшоў пад дом па вуліцы Мазавецкай 11, дзе жыла сям’я Канапацкіх пасля прыезду з Вільні ў 1946 г. Гасан тады быў ужо пенсіянерам — нарадзіўся ў 1879 г. у Мінску. Прыехаўшы ў Польшчу, меў за сабою прафесійную службу ў царскім войску, дзе даслужыўся звання палкоўніка. У кастрычніку 1919 г. Юзаф Пілсудскі прызначыў яго камандзірам беларускіх аддзелаў у польскім войску. У міжваенны час дзейнічаў у Беларускім грамадзянскім сабранні, Часовай беларускай радзе, „Беларускай хатцы” ў Вільні. Выдаваў часопіс „Беларускі радны”, які прапагандаваў удзел беларусаў у самаўрадах. Сябраваў м.інш. з Францішкам Аляхновічам. У час вайны пісаў фельетоны пра сны Сталіна ў Аляхновічаву газету „Беларускі голас”. Быў тады таксама старшынёй бацькоўскага камітэта ў Віленскай беларускай гімназіі, дзе вучыўся яго сын Мацей. У 1945 г. аказалася, што трэба было як найхутчэй выязджаць з Вільні, каб не трапіць у ссылку на ўсход. Канапацкія былі занесеныя ў спісак на вываз. Быдгашч аказалася апошнім прыстанішчам на жыццёвым шляху Гасана. Сын Мацей працягваў навуку ў ліцэі, каб пасля паступіць ва універсітэт. Дачка Тамара працавала. Гадаваўся ў Быдгашчы яе сын Славамір. Пасля смерці Гасана сям’я Канапацкіх пераехала ў Сопат, дзе і зараз жывуць яго дзеці Тамара і Мацей.

Ідучы па Быдгашчы Мацей успамінаў свае маладыя гады і бацьку, якога яшчэ памятаюць старажылы з Мазавецкай 11. На могілках над магілай Гасана Канапацкага маліўся імам Рафал Бергер, які асабіста дбае пра магілу і добрае імя пакойніка, каб не забыліся ў Быдгашчы пра татарына — змагара за беларускую незалежнасць. Музей Паморскай ваеннай акругі ў Быдгашчы мае экспазіцыю прысвечаную Гасану Канапацкаму, а яго магіла знаходзіцца ў спіску вайсковых магіл, якія ахоўваюцца дзяржавай.



*Андрэй Вангін (стаіць першы справа) з суседзямі (1950-я гады)*

### Андрэй Вангін-Блажэвіч

Другое памінанне адбылося на могілках у Гневе. Там 17 мая, у суботу, гданьскія беларусы пры ўдзеле мясцовых элітаў адкрылі помнік Андрэю Вангіну, даўняму члену Беларускага грамадска-культурнага таварыства, а ў міжваенны перыяд — акцёру тэатра Уладыслава Галубка. Яшчэ да нядаўна ягоны лёс быў нявысветлены. Ніхто не ведаў, што з ім здарылася, калі і дзе памёр. Калі ў 1967 г. у Гданьску заснаваўся гуртох БГКТ, Андрэй Вангін стаў яго актыўным членам. Раней дзейнічаў у самадзейных тэатрах у Рускім культурна-асветным таварыстве і Украінскім грамадска-культурным таварыстве. Быў ён адзінокім, не меў у Гданьску сям’і. З 1968 г. жыў у доме для састарэлых у Гдыні. Было яму тады ўжо 73 гады.



*Артыст Беларускай дзяржаўнай трупы Андрэй Блажэвіч (1920-я гады)*

Андрэй Вангін нарадзіўся 30 лістапада 1895 г. у Відзах на Браслаўшчыне. Якім чынам апынуўся на Узбярэжжы пасля вайны, здаецца, нікому не здрадзіў. Першы пра яго ўпамянуў Міхась Хмялеўскі на старонках „Нівы” ў 1970 г., публікуючы кароткую звестку пра галубкоўца А. Блажэвіча (тэатральны псеўданім Вангіна) і яго здымак. Жывучы ў доме для састарэлых, наведваў беларускі клуб у Гданьску пры Доўгім Таргу. Яго адведвалі Ірэна Мельнікаў і Анна Красько. Абедзве ўспамінаюць, як наракаў на адзіноту. Раптам вясной 1977 г. не стала яго ў доме для састарэлых у Гдыні. Праз 25 гадоў высветлілася, што паколькі пагоршыўся стан яго здароўя, адправілі яго ў Гнеў — у адпаведны дом. Там пасля 19 дзён памёр. Было гэта 18 мая 1977 г. Пахавалі яго на каталіцкіх могілках у Гневе, у той частцы, дзе хавалі жыхароў дому для састарэлых. Вядома, што пасля 25 гадоў па магіле і следу не стала. Аднак пры спрыяльных адносінах да ідэі ўстанаўлення помніка ўлад Гнева, мясцовага рымска-каталіцкага ксяндза Багдана Пшыбыша і супрацоўнікаў Гнеўскага дому для састарэлых магіла знайшлася. Трэба было „скінуцца” на помнік, які з граніту вельмі хутка выканаў мясцовы каменячос Рышард Адамчык. Гэта поўнасцю грамадская ініцыятыва гданьскіх беларусаў (далучыўся да нас і Генеральны консул Рэспублікі Беларусь у Гданьску Міхал Аляксейчык). Шчасліва ў доме для састарэлых захавалася архіўная дакументацыя Андрэя Вангіна. Знайшла яе Тэрэса Эльманоўская. Помнік адкрылі бурмістр Гнева Багдан Бадзёнг, дырэктар Дому для састарэлых Мечыслаў Матысяк і нашая Анна Іванюк. Маліўся над магілай і пасвянціў яе ксёндз Багдан Пшыбыш. Нашыя харысткі праспявалі „Вечная памяць” і „Хрыстос уваскрос”. Успаміналі над магілай Андрэя Вангіна Анна Іванюк і сябры-суседзі, якія жылі з ім у адным доме з 1946 па 1968 год — Барбара Ліміновіч і Уладыслаў Залускі. Прамаўлялі таксама бурмістр і дырэктар Дому для састарэлых — у духу польска-беларускага паяднання. Удзельнікі ўрачыстасці ўзлажылі на магілу кветкі (таксама прадстаўнік Генеральнага Консульства Рэспублікі Беларусь у Гданьску) і запалілі знічы. Пасля ўрачыстасці на могілках Мечыслаў Матысяк запрасіў усіх на памінальны абед у дом для састарэлых. Па абедзе сакратар горада і гміны Гнеў Станіслаў Лямкевіч запрасіў на экскурсію па горадзе. Завёў гасцей на крыжацкі сярэднявечны замак, якім Гнеў вядомы не толькі ў Польшчы. Шмат гасціннасці і сардэчнасці аказалі нам гаспадары, што было нам і — думаем — пакойнаму Андрэю Вангіну мілай неспадзяванкай.

Лена Глагоўская




*Над магілай Андрэя Вангіна. Злева: Мечыслаў Матысяк, Лена Глагоўская і Станіслаў Лямкевіч*





# Нашы дамы, наша спадчына

Да I сусветнай вайны ў падляшскіх вёсках стаялі шэрагі нізкіх, пабеленых глінкай або вапнай хат. У дваццатых гадах мінулага стагоддзя ў праваслаўных вёсках нечакана з'явіліся колер і багаты дэкор — беленыя карнізныя і капяжныя ліштвы, маляваныя аканіцы, упрыгожаныя вокны, а затым і цэлыя сцены. У некаторых вёсках (напрыклад, у Рыбалах) пашыралася маляванне платоў. Упрыгожваліся дзверы, высоўваліся капяжы і бэлькі перакрыццяў, накладаліся каляровыя ажурныя абіўкі вуглоў і надаконныя ліштвы ды рэзьбленыя падаконнікі, адмыслова абіваліся франтоны, а дошкі старанна прафіляваліся; пакоі ўнутры бяліліся, а ў багацейшых дамах маляваліся па шаблону або выклейваліся абоямі.

Самае вялікае развіццё дэкору наглядалася ў 1935-1950 гадах, але выконваючыя ўпрыгожанні сталяры і цесляры яшчэ і сёння дзейнічаюць у некаторых вёсках, напрыклад, у Войшках. Старыя ўпрыгожаныя дряўляныя будынкі таго часу складаюць 80% усіх дамоў у Войшках, Пухлах, Сацах, Целушках і Чыжах. Але вёскі пусцеюць, сядзібы разбураюцца, старыя драўляныя хаты і халодныя пабудовы хіляцца долу, таму ў 2002 г. на Архітэктурным аддзяленні Політэхнічнага інстытута ў Беластоку пачалiся пошукі матэрыялаў датычных старой вясковай архітэктуры, асабліва дэкору дваццатых, трыццатых і пазнейшых гадоў. Вядзецца збор старых фатаграфій, успамінаў жыхароў і ўсяго, што можа памагчы знайсці адказы на пытанні: адкуль на гэтай тэрыторыі такі багаты і непаўторны дэкор, адкуль такая арыгінальнасць архітэктуры, чаму ўпрыгожанні пашыраліся акурат тады і адкуль браліся ўзоры? Ці чытачы дапамогуць атрымаць адказ на гэтыя пытанні?

Некаторыя сцвярджаюць, што надаконныя ліштвы і абіўку вуглоў вырэзвалі па шаблонах, прывезеных у дваццатых гадах бежанцамі. Менавіта ў 1915 годзе чуткі аб зверствах немцаў і прымус з боку казакоў сталі прычынай абезлюдзення большасці праваслаўных вёсак, жыхары якіх па 5-7 гадоў бадзяліся па бязмежных і шматнацыянальных абшарах Расійскай імперыі. У тым часе многія вёскі на Падляшшы згарэлі ў пажарах. Вяртаючымся бежанцам часта прыходзілася ставіць будынкі ад фундаментаў. Многія раней працавалі разам з рускімі майстрамі, а цяпер ім самім прыйшлося ўзводзіць свае дамы. Не ведаем, ці рэпатрыянты прывезлі з Расіі, Украіны, Беларусі цяслярскія шаблоны з узорамі ўпрыгожанняў, ці можа невядомая тут раней мода багатай арнаментоўкі ўзнікла як успамін па дамах з наваколля Архангельска, Масквы, або дамах у Расіі, а, мабыць, у Карэліі, на Украіне, або ва ўсходняй і цэнтральнай Беларусі, дзе цяслярскае рамяство стаяла на высокім узроўні. Першыя бежанцы сталі вяртацца ў 1918 г., але большасць толькі пасля 1921 г. і тады на Падляшшы пачалася „мода" на большыя хаты, з багатай арнаментоўкай, будаваныя асобна ад хлявоў. Сапраўды, некаторыя дамы вылучаюцца тыпова ўсходнімі матывамі — у вяршынях ветраніц замест мазавецкіх *ṡparogów* сустракаюцца *вільчыкі* характэрныя для ўсходняй Беларусі, або радзей г.зв. *полотенце* — папулярныя ў глыбі Расіі адзіночныя дошкі выразаныя па ўзору дэкаратыўных тканін.

Памерлы ўжо польскі этнограф, прафесар Вітальд Дыноўскі ў 1935 г. меркаваў, што крыніцы вясковага дэкору Навагрудчыны, Віленшчыны і Падляшша бяруцца з распаўсюджання дошак і піл з вузкім вастрыём. Менавіта раней, да I сусветнай вайны, для будавання прымянялася колатае дрэва — дылі, дошкі, гонты. У 1915 г. немцы пачалі грабежніцкую высечку пушчаў (між іншым, Кнышынскай і Белавежскай), пабудавалі шматлікія тартакі і шчыльную сетку вузкакалеек для вывазу драўніны. Пасля вайны тартакі працавалі далей, дзякуючы чаму з'явілася многа добрага матэрыялу. Дылі і дошкі з-пад пілы, якія раней былі дарагія, у дваццатых гадах сталі таннейшымі і агульнадаступнымі. Недарагое, добрае дрэва, даступныя дошкі і лобзікі — новыя пілы для выпілоўвання ажурных узораў дасталіся ў рукі сапраўдных вясковых майстроў, якія скора распрацавалі свой стыль упрыгожвання дамоў. Пазней у літаратуры падляшскую арнаментоўку назвалі лобзікавым дэкорам. Таксама шкло пасля I сусветнай вайны стала таннейшым і агульнадаступным матэрыялам, таму да нашага дня захаваліся шматлікія старыя веранды зашклёныя дзесяткамі невялікіх каляровых шыбін, упрыгожаныя ўзорыстай разьбой і часта фантазійна размаляваныя.

Некаторыя даследчыкі ўпрыгожванне падляшскіх дамоў выводзяць з царкоўнага дэкору. Пацвярджае гэта чарговасць здарэнняў: праўда, цэрквы ўпрыгожваліся значна раней, але больш багатая арнаментоўка з'явілася пасля Студзеньскага паўстання — пасля 1865 г. пачалі будавацца новыя драўляныя храмы з адмыслова ўпрыгожанымі ганкамі, фрызамі, дзвярыма і вокнамі, арнамент дадаваўся таксама да старых цэркваў. Да сённяшняга дня захаваліся сакральныя аб'екты з багатай арнаментоўкай выразанай у дрэве, між іншым, цэрквы ў Ласінцы, Пасынках, Падбеллі, Плёсках, Пухлах і Трасцянцы. Сапраўды, некаторыя ўпрыгожанні, напрыклад, акон у цэрквах і хатах маюць многа супольных рысаў, але не ведаем, ці ў сапраўднасці ўпрыгожанні хат выводзяцца з царкоўнага дэкору.

Яшчэ іншыя вытокі багатых упрыгожанняў бачаць даследчыкі ў народным фальклоры і ў... сялянскіх сэрцах. Тлумачаць яны, што за царскім часам трэба было плаціць падаткі ад кожнага акна, таму вокны ў хатах былі малыя і нешматлікія. Вокны асацыяваліся з багаццем і міфамі, паводле якіх цераз акно ў хату маглі пранікнуць злыя духі. Адмена пааконнага падатку заахвоціла сялян рабіць большыя вокны, але міфы і старыя паданні засталіся і схілялі да таго, каб вокны ахоўваць: абвесці іх ліштвамі, упрыгожыць разным надаконнікам, забяспечыць аканіцамі. Але калі ўпрыгожваліся вокны, тады і вуглы, на якіх трымаўся дом, а затым і франтон. Таксама і магічная сімволіка дзвярэй схіляла сялян упрыгожваць іх і аббудоўваць, у выніку чаго папулярнымі сталі вітражныя веранды.

Яшчэ адзін фактар мог паўплываць на характар упрыгожанняў. Менавіта ў трыццатых гадах і пазней склалася надта прадукцыйная арганізацыя працы: дамы ставіліся вясною і летам, а позняй восенню, калі канчаўся будаўнічы сезон, цесляры ў сваіх майстэрнях выконвалі ўпрыгожанні, падаконнікі і надаконнікі, узорыстыя капяжныя ліштвы, ветраніцы і багата арнаментаваныя кажухоўкі на вуглах. Новая сістэма працы высвятляе падабенства ўзораў у суседніх вёсках: падобныя матывы папросту паходзілі з той жа цяслярскай майстэрні і рабіліся на склад. Больш таго, брыгады нанятых цесляроў выконвалі іх бясплатна, паколькі багата ўпрыгожаныя дамы былі свайго роду рэкламай вясковаму майстру.

Айцец Рыгор Сасна падае, што дамы ўпрыгожвалі самі сяляне; у 1999 г. у некаторых вёсках жылі яшчэ цесляры або сяляне, якія ў пяцідзесятыя гады займаліся ўпрыгожваннем хат. Напрыклад, Уладзімір Наумюк з Канюкоў. Аб іншых цеслярах засталіся легенды — у памяці аднавяскоўцаў жыве памяць аб Аляксандру Паўлючуку з Гацькоў. А можа жывуць яшчэ майстры, якія маглі б падзяліцца з намі сваім вопытам? А можа чытачы памятаюць як калісь будавалі, чаму дамы ўпрыгожваліся, адкуль браліся ўзоры, адкуль прыйшла гэтая мода? Чакаем лістоў і званкоў у рэдакцыю або пісем аўтару па электроннай пошце: jarsz@pb.bialystok.pl.

Яраслаў Шэўчык

# Пры адбудове моста працавалі дзеці

**Успаміны Анны АСІПЮК, народжанай у 1932 годзе ў Орлі.**

Калі ў верасні 1939 года выбухла вайна, мой тата атрымаў павестку ў Бельск. Я з сястрой Кацяй, старэйшай за мяне на тры гады, праводзілі бацьку на гасцінец, што з Локніцы ў Бельск. Калі тата адыходзіў, мы плакалі і махалі рукамі; праз нейкі час ён вярнуўся дадому.

У школу я ўспела схадзіць толькі ў прыгатаваўчы клас. У Крывую прыязджала настаўніца з двара ў Шчытах, пані Астасевіч; яе з двума сынамі саветы ў 1940 годзе вывезлі ў Казахстан. Пасля вучыла Ольга Назарук, якая крыху разумела па-нямецку. Да яе ў школу прыязджаў нейкі нямецкі афіцэр і яна загадвала вітацца і развітвацца з ім панямецку.

Калі прыйшлі немцы, у Крывой асталося многа рускіх палонных. Але людзі баяліся браць іх да работы, бо прадчувалі, што немцы вайны не выйграюць і калі рускія вернуцца, могуць быць клопаты. Людзі прасілі нямецкага агранома, каб прызначаў ім на працу арлянскіх яўрэяў. Багацейшым гаспадарам прызначалі на працу тых вяскоўцаў, каторых не забралі на прымусовыя работы ў Германію. Апрача таго людзі адраблялі шарварак будуючы дарогу ў Орлю; разбівалі нагробныя пліты з яўрэйскіх могілак і масцілі імі дарогу.

Яшчэ да вайны я пасвіла кароў. Ужо ў 6-7 гадоў усё рабіла, напрыклад, ездзіла вярхом на кані. Пад нямецкай акупацыяй я разам з сястрой працавала пры адбудове моста на Арлянцы, які былі спалілі партызаны. Мы перасявалі жвір, нешта падавалі рабочым. Працавалі мо з год. Рыдлёўкі дадому насілі. Я сваю клала на гарышча, каб у хаце было чыста, і так аднойчы ўпала з драбіны і выбіла сабе руку. Ад лячэння ў мясцовага кастаправа не было паправі і тата завёз мяне ў Орлю да лекара Смульскага. А ў працы мяне любілі і згадзіліся на тыднёвую бальнічную адсутнасць.

У вайну тата выкапаў за клуняй схованку; там былі пярыны, падушкі і найпатрэбнейшыя рэчы. Заўсёды мы туды хаваліся ў час бамбёжак. У 1944 годзе саветы вывезлі з Крывой сем чалавек. Адзін з іх, Ян Стральчук, трапіў у Сталінагорск у капальню урану; пасля расказваў, што працавала там пяць тысяч чалавек: па тысячы літоўцаў і немцаў і тры тысячы палякаў.

Пасля вайны ў вёсцы не было з чаго жыць. Хадзілі мы наймацца на працу ў багацейшых людзей. Было мне трынаццаць гадоў, калі пайшла з бацькам жаць. Ён мне гаварыў „Ты толькі будзь", а сам працаваў за дваіх. А пасля я ўжо пайшла і сама працаваць.

Запісаў Міхал Мінцэвіч

# Помнік прыроды

*Cuius est potentia, eius est actum* — чыя сіла, таго і закон. Гэтая лацінская прыказка адносіцца не адно да чалавечых дачыненняў. Праяўленне сіл прыроды ў шматлікіх міфалогіях лічылася актам волі багоў. Гэтыя ўяўленні не абмяжоўваліся адно да прыродных дынамічных з'яў, як буры ці паводкі, але і м.інш. да магутных дрэў. У біблейскіх сюжэтах часта важныя падзеі адбываліся ў прысутнасці раслін, напр. з Майсеем Бог гутарыў з палаючага куста, а анёл, які з'явіўся Гедэону, сеў пад дубам. У Палесціне шырока распаўсюдзілася павер'е, што дрэвы ўбіраюць у сябе сакральную моц пахаваных пад імі прарокаў ці іншых угоднікаў і ў менталітэце тамашніх жыхароў усталявалася забарона гаспадарчага ўжывання драўніны з пазначаных святасцю дрэў, галоўным чынам магутных дубоў. Для сакральнага будаўніцтва Іерусалімскага храма цар Саламон купляў шляхетныя кедры ў Ліване. У Старажытным Егіпце найбольш надзеленымі святасцю раслінамі былі лотас і папірус, менш — сікамор, вярба і пальма. Ды і ў даўніх славян і іхніх суседзяў дрэвы ўвасаблялі звышчалавечую моц. З насычанай святасцю драўніны язычнікі выразвалі сваіх ідалаў. І тае святасці было дастаткова — не патрабавалася дадатковых рытуалаў з паліваннем іх паліванай вадой. Біблія (Іс. 44:14) згадвае, што ідалаў для пакланення язычнікі выраблялі з кедра, дуба, ясеня і сасны.

Язычніцкі атавізм, нягледзячы на тысячагадовую прысутнасць хрысціянства, захаваўся ў нас. Мы адчуваем, калі не страх, дык пашану для магутных сіл прыроды, у тым і з насцярожанасцю ставімся да вялікіх дрэў, напр. у Белавежскай пушчы асаблівай пашанай, быццам у колішняй Палесціне, карыстаюцца магутныя дубы. Лічыцца таксама, што і сучасныя культавыя абразы, пісаныя на драўніне, маюць у сабе больш сакральнасці чым іншыя.

Побач дарогі з Касцюкоў у Харошчу расце велічная сасна (на здымку; на вялікі жаль, не ўдалося мне ахапіць цэлай яе кароны маім фотаапаратам, адно толькі магутныя ралы пры ствале), яна аб'яўлена помнікам прыроды. У ранейшы час яна расла адзінока і ніхто ёй не перашкаджаў дасцігнуць буйных размераў. Сёння навокал яе поўна маладога напорыстага беразняку і сасняку, які неўзабаве, быццам Геракл Антэю, адбярэ ёй жыццядайныя сокі зямлі. Самая метка помніка прыроды не выратуе масцітага дрэва ад засыхання. Фармальныя паводзіны, не адно свецкія, становяцца сёння нормай.

Аляксандр Вярбіцкі



Фота Аляксандра Вярбіцкага

# Велясіпедам цераз лес

У канцы чэрвеня г.г. адкрылі два новыя (зялёны і блакітны) веласіпедныя шляхі цераз Белавежскую пушчу. Блакітны шлях 42-кіламетровай даўжыні. Вядзе ён уздоўж запаведнікаў „Глыбокі кут", „Нязнанава", „Беразова" і „Альшанка — Мыслішчэ" ў Тапіла. Назад бяжыць цераз вёскі Пяскі і Арэшкава ў Гайнаўку. Затым зялёны шлях (41 км) пачынаецца ў Белавежы і вядзе цераз вёску Падцарква ў Дубічы-Царкоўныя.

Шляхі бягуць цераз вёскі і натуральныя лясы Белавежскай пушчы. Тут прыгожыя вясковыя краявіды з багаццем драўлянай архітэктуры. Адрэзкі шляхоў, якія вядуць цераз Белавежскую пушчу праходзяць цераз маляўнічыя мясціны ў далінах, між іншым, рэчак Лясной і Хвішчэя.

Веласіпедныя маршруты — ёсць такія меркаванні — прычыняцца да развіцця веласіпеднага турызму і гэтым самым да актыўнага спосабу адпачынку. Адкрываюць іх згодна з ініцыятывай Сусветнага фонду дзеля прыроды, Павятовага староства ў Гайнаўцы ды гмінных улад у Белавежы, Дубічах-Царкоўных, Гайнаўцы і Нараўцы. (яц)



Фота Уладзіміра Сідарука

*Заслужаныя для чыгункі*

# Юбілей дызельнай цягі

14 чэрвеня побач Чаромхаўскага ГОК адбыўся фэст, арганізатарам якога выступіла Прадпрыемства чыгуначнага рухомага саставу. Нагодай было 55-годдзе дызельнай цягі. У Чаромху завіталі высокія рангам чыгуначныя начальнікі прадпрыемства „Cargo".

Аб гісторыі дызельнай цягі расказаў старшыня прафсаюзнай арганізацыі машыністаў Здзіслаў Чаркоўскі. Войт гміны Міхал Врублеўскі адзначыў Юзафа-Баляслава Сідорскага Сярэбраным крыжам заслугі. Віктар Шатыловіч і Аляксандр Тычына атрымалі ганаровыя значкі „Zasłużony dla transportu Rzeczypospolitej", а дванаццаць працаўнікоў прадпрыемства ўдастоіліся значкамі „Zasłużony dla kolejnictwa".

Арганізатары, узнагароджаныя і запрошаныя госці сустрэліся на банкеце ў рэстаране, а затым паехалі ў Белавежу. Чарамшанам пакінулі ў падарунку цыганскі калектыў „Гітана" з Ольштына пад кіраўніцтвам Адама Люлька Фэдаровіча. Амаль паўтарагадзінны канцэрт спадабаўся публіцы, за што атрымалі моцныя апладысменты, а ад арганізатараў Лявон Купрыцюк „найпрыгажэйшай цыганцы" падорыў букет кветак. За міла праведзеныя хвіліны на чыгуначным фэсце арганізатарам і спонсарам належыцца падзяка.

Уладзімір Сідарук

# Новы тратуар у Орлі

Дзякуючы бельскаму староству папраўляецца выгляд галоўных вуліц у цэнтры Орлі. Арлянскімі вуліцамі — Бельскай, Міцкевіча і Кляшчэлеўскай праходзяць тры павятовыя дарогі. Ад некалькіх гадоў Павятовая ўправа дарог пастаянна адводзіць грашовыя сродкі для мадэрнізацыі тратуара на вуліцы Бельскай. У 1999 годзе на маю — тадышняга раднага — прапанову на павятовых вуліцах былі ўстаноўлены гарызантальныя дарожныя знакі пешапраходаў; прычынілася гэта да паправы бяспекі пешых.

У гэтым годзе ПУД прызначыла Орлі 250 квадратных метраў шасцісантыметровай брусчаткі (у папярэдніх гадах былі тратуарныя пліткі) і 67 штук абмежавальных брусоў. Новы тратуар пакладзены гміннымі рабочымі каля Гміннай управы і аўтобуснага прыпынку. На старыя тратуарныя пліткі ёсць ахвотныя, але гміна іх не прадае; недзе яшчэ маюць быць выкарыстаны. Варта згадаць яшчэ, што шмат вуліц у Орлі астаецца без тратуараў.

Міхал Мінцэвіч

# Белая нядзеля ў Нараўцы

29 чэрвеня гэтага года адбылася ў Гмінным асяродку здароўя ў Нараўцы так званая „белая нядзеля". Сюды прыехалі лекары розных спецыяльнасцей: кардыёлаг, ларынголаг, артапед, гінеколаг. Яны даследавалі людзей з рознымі недамаганнямі, давалі парады і выпісвалі рэцэпты.

На месцы медсёстры выконвалі пацыентам электракардыяграмы, мералі ціск крыві і колькасць глюкозы ў арганізме. Да людзей у белых фартухах прыйшло мноста жыхароў Нараўкі і ваколіц. Былі немалыя чэргі.

Трэба дадаць, што на працягу мая і чэрвеня наведвалі Нараўку спецыялісты па хваробах лёгкіх, даследавалі шчыльнасць касцей (астэапароз), а таксама прастату ў мужчын. Жыхары гміны дзякуюць службе здароўя за апеку над хворымі.

Мікалай Варанецкі

# Выбяруць войта

18 чэрвеня г.г. арлянская Рада гміны прыняла пастанову аб заканчэнні тэрміну паўнамоцтваў памерлага войта Яна Добаша. Выбары новага войта адбудуцца ў пачатку жніўня, праўдападобна 3 чысла.

Кандыдатаў на гэтую пасаду многа, сярод іх і тыя, якія і раней балаціраваліся на гэтае месца. (мінц)


Ніва ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ

**Выдавец**: Праграмная рада тыднёвіка „Ніва".
**Старшыня**: Яўген Міраловіч.
**Адрас рэдакцыі:** 15-959 Białystok 2, ul. Zamenhofa 27, skr. poczt. 149.
**Тэл./факс:** (0 10xx 85) 743 50 22.
**Internet**: *http://niva.iig.pl*
**E-mail**: *redakcja@niva.iig.pl*

*Zrealizowano przy pomocy finansowej Ministerstwa Kultury.*
**Галоўны рэдактар:** Віталь Луба.
**Сакратар рэдакцыі:** Аляксандр Максімюк.
**Рэдактар „Зоркі":** Ганна Кандрацюк-Свярубская.
**Публіцысты:** Мікола Ваўранюк, Аляксандр Вярбіцкі, Ганна Кандрацюк-Свярубская, Міраслава Лукша, Аляксей Мароз, Ада Чачуга, Паўліна Шафран.
**Канцылярыя:** Галіна Рамашка.

**Камп'ютэрны набор:** Яўгенія Палоцкая, Марыя Федарук.
**Друкарня**: „Orthdruk", ul. Składowa 9, Białystok.
Tekstów nie zamówionych redakcja nie zwraca. Zastrzega sobie również prawo skracania i opracowania redakcyjnego tekstów nie zamówionych. Za treść ogłoszeń redakcja nie ponosi odpowiedzialności.
**Prenumerata:** 1. Termin wpłat na prenumeratę na IV kwartał 2003 r. upływa 5 września 2003 r. Wpłaty przyjmują urzędy pocztowe na terenie woj. podlaskiego i oddziały „Ruch" na terenie całego kraju.

2. Cena prenumeraty na IV kwartał 2003 r. wynosi 26,00 zł.

3. Cena kwartalnej prenumeraty z wysyłką za granicę pocztą zwykłą — 115,00; pocztą lotniczą Europa — 127,00; Ameryka Płn., Płd., Środk., Afryka, Azja, Australia — 153,00. Wpłaty przyjmuje „RUCH" S.A., Oddział Krajowej Dystrybucji Prasy, ul. Jana Kazimierza 31/33, 01-248 Warszawa, Pekao S.A., IV O/Warszawa, Nr 12401053-40060347-2700-401112-005.

4. Prenumeratę można zamówić w redakcji. Cena 1 egz. wraz z wysyłką w kraju wynosi 3,40 zł, a kwartalnie — 44,20 zł; z wysyłką za granicę pocztą zwykłą — 4,70 (kwartalnie — 61,10), pocztą priorytetową: Europa — 5,90 (76,70), Ameryka Płn., Afryka — 6,60 (85,80), Ameryka Płd., Środk., Azja — 7,40 (96,20), Australia — 9,60 (124,80). Wpłaty przyjmuje Rada Programowa Tygodnika „Niwa", Białystok, ul. Zamenhofa 27, nr konta PBK S.A., I Oddział Białystok, 11101154-401150015504.



Фота МІХАЛА КОСЦЯ

# Смешная старонка

Коля Здунюк намаўляе мяне, разахвоціўшыся навінкай-Інтэрнэтам, каб я сабе зрабіў старонку <www>. Гэта так, быццам жывы чалавек стаў віртуальным, уяўным, хоць відочным. Другое ў яго жыццё, і кожны чытач ці глядач, як іх там назваць, уключыўшы камп'ютэр, можа сабе знаёміцца з табою. Значыць, з тым, якім ты сябе прадстаўляеш. І то кожны з усяго свету, які табою зацікавіцца. Можаш паказаць свой фэйс, свае дасягненні, сапраўдныя ці ўяўныя, паправіць імідж, дадаць сабе красы. Нават спявачка Марылька, якая цяпер афіцыйна ды бессаромна глытае марожанае са сваім дагістарычным каханкам Данелем (перасталі быць зоркамі, ці што, дык зноў ва ўспаміны сваіх аматараў лезуць), сама прызналася, што камп'ютэр палову яе зрэзаў, усе тыя тоўстыя складкі і маршчыны. Усё для таго, каб таму, хто будзе нажырацца каларыйным марожаным, не адабраць ахвоту відам заплылай тлушчам пяячкі, а наадварот — заахвоціць ды адняць боязь, што будзе гэтак выглядаць — як паказны сапраўдны аб'ект халестэрынавай бомбы. А так — абсякуць справа і злева, даціснуць віртуальна „васьміпак" на жываце, падцягнуць скуру на шчоках — і ты аб'ект захаплення і зайздрасці іншых карыстальнікаў ці то ежы, ці то камп'ютэрнай тэхнікі.

— А што ты, Коля, у гэтым Інтэрнэце паказваеш? Ты ж — сантэхнік. Выдатны, праўда, ды і што з таго.

— Я — „Мікалай Здунюк — залатая ручка". Спецыяліст па трубах, шрубах, рэчах, печах, дахах, стрэхах...

— Ну, паказвай!

— Вось і здымак, першая прэзентацыя: „Коля п'е колу". А тут Коля на ўвесь рост, з напнутымі цяглімі. Гэта выклікае ў людзях давер, што я моцны і салідны. На фоне — хата. Стары бацькаў дом у Нарве, крыты белым сэйдынгам. Пахнуць ліпы. Зялёны колер дрэў, а вось тут неба блакітнае, як трэба. Экалагічна. Тэхніка тэхнікай, але мы дбаем і пра душу, — стаў выпендрывацца Коля. Чую я такое ад яго першы раз!

— О, бачу, і з „Нівы" мой фельетон?

— А як жа ж. Быў я ж не раз тваім натхненнем, га, Вандал? І табе, хочаш, трэба будзе зрабіць старонку. Оля з Саколкі ўрэшце з табою пазнаёміцца.

— Адчапіся! Як убачыць, дык і адхочацца ёй чытаць. Яна ж маладая дзеўка!

— Дык трохі прыхарошым. Мой унучак так цябе адмалюе, што і сам сябе не пазнаеш. Тэксты ўставім што лепшыя па-беларуску, і ў перакладзе... Пажадана было б, здаецца, па-англійску, бо ж на ўвесь свет...

— Не ведаю, ці будуць яны зразумелыя для людзей іншых рэалій ды культуры... А нашто ўсё гэта! — стаў адмахвацца я. — Я такі сціплы чалавечак...

На тым справа і закончылася. Колеў унучак Яраслаў не зрабіў мне старонкі. Ды праз два тыдні на маю мейлевую пошту прыйшоў ліст ад Агаты, мае жонкі з Амерыкі.

— Вандал, прачытала я твае старыя дурноты, „казкі для дарослых", у Інтэрнэце. „Сто твараў" загаловак, заяўляецца, што будзе працяг. Мог бы ты, стары, не выпендрывацца, здымак даць хоць крыху на сябе падобны. Ужо ж ты не такая пачвара, каб саромецца ўласнага твару! „Сто твараў", ха-ха-ха! „З класікі гумару!" Ха-ха-ха!" „Vandalin Orlansky!"

Папашукаў я тыя тэксты, ды не знайшоў. Мабыць, у гэты раз Агата з мяне пажартавала. А, можа, гэта правакацыя?..

Вандал Арлянскі

**Фэстываль Музыкі Маладой Беларусі**

## Басовішча 2003

18-19 ліпеня 2003 г., Гарадок, Беласточчына

**18/19 ліпеня (пятніца/субота)**

$16^{30}$ — адкрыцьцё Фэстывалю
$16^{45}$ — пачатак конкурснай часткі
$21^{30}$ — канцэрт узнагароджанага гурту мінулагодняга выпуску — „Дзея"
$22^{10}$ — „Зьніч"
$22^{50}$ — „Rima"
$24^{00}$ — „Зэт"
$1^{10}$ — „Cool Kids of Death"

**19/20 ліпеня (субота/нядзеля)**

$16^{00}$ — аб'яўленьне вынікаў конкурсу — канцэрт пераможцаў
$17^{15}$ — „BN"
$18^{00}$ — „Partyzone"
$19^{00}$ — „Крама"
$20^{10}$ — „Кальян"
$21^{20}$ — „Deviation"
$22^{30}$ — „Neuro Dubel"
$23^{40}$ — „Zero-85"
$0^{50}$ — „Уліс"
$2^{00}$ — „Н.Р.М."

Арганізатар — Беларускае Аб'яднаньне Студэнтаў — пакідае за сабою права ўносіць зьмены ў гэтую праграму.

Адзіная праўдзівая і акуратная гісторыя „Басовішча" па адрасе **http://niva.iig.pl/fmmb/fmmb.htm**

# Адгаданка

## Рыцар

(анаграмная шарада)

*Любар быў храбры і* ***НАДЗІ*** *ён сваёй сказаў:*
*Я сам паб'ю варожы полк, датла!*
*І рушыў* ***У*** *паход, узброены ад галавы да пят.*
*На ростанях дарог спаткаў ён гурт салдат*
*І рынуўся на іх. А яны гуртом яго звалілі;*
*Зброю* ***НЕ*** *аднялі, а зубы паскалілі!*
*Пасля ў шынок войска пайшло і там* ***ПІЛО ВІНО****.*
*А Любар над Надзіны абцас залёг даўно...*

(Ш)

З літар патоўшчаных слоў скласці рашэнне — прыказку — з першымі літарамі і іх лікам у паасобных адгадваемых словах: **А-5, У-1, П-4, Н-2, В-4.**

Сярод чытачоў, якія на працягу месяца дашлюць у рэдакцыю правільныя рашэнні, будуць разыграны кніжныя ўзнагароды.

**Рашэнне адгадванкі з 21 нумара**

**Надзея Артымовіч**.

Кніжныя ўзнагароды высылаем **Лукашу Пацэвічу** з Беластока і **Казіміру Радошку** са Свебадзіцаў.

# „Даўціпы" *Андрэя Гаўрылюка*

Па запрашэнні чорта святы Пятро прыбывае з візітам у пекла. Глядзіць, а там адзін грэшнік адной рукой абдымае голую дзяўчыну, а ў другой трымае бутэльку самагонкі.

— І гэта мае быць пякельная кара? — дзівуецца Пётр.

— Безумоўна! — рагоча чорт. — Бутэлька самагонкі мае ў дне дзірку, а дзяўчына не мае.

* * *

У рэстаране:

— Спадзяюся, што не перашкаджаю вам курыць, калі ем?!

— Што вы! Я, нягледзячы на вас, нават чую аркестр.

* * *

На экзатычным пляжы турыст пытае ратаўніка:

— Ці можна тут купацца не апасаючыся акул?

— У гэтым аспекце няма ніякай небяспекі.

— Ці напэўна?

— Вядома: там дзе ёсць кракадзілы, няма акул.

* * *

— У мяне да цябе жаль, што ты спаў з маёй жонкай.

— А каб цябе кот убрыкнуў! Я нават вока не сплюшчыў.

* * *

Пастар папераджае п'яніцу:

— Баюся, што не зможам сустрэцца ў небе.

— А што ж вы, пастар, начвэрылі?!

* * *

— Чаму нельга пажадаць чужой жонкі?

— Бо пасля можна мецъ яе на ўтрыманні.

* * *

— Чаму жанчыны цалуюцца ў час прывітання?

— Бо не выпадае кусацца.

* * *

— Калі можам гаварыць пра чыстую любоў?

— Пасля купання.

* * *

Малы Янка перад выездам на канікулы пытае маму:

— Ці сёлета паедзем на мора з тым самым таткам, што і ў мінулым годзе?

* * *

Лекар абслухоўвае хворага:

— Дыханне адсутнічае, сэрца не чую. Або стэтаскоп папсаваўся, або вы ўжо мёртвы.

* * *

Багацей ляжыць на смяротным ложку. Побач яго сядзіць святар, які мае яго падтрымліваць у цяжкую хвіліну.

— Ох, каб мог я забраць сваё золата туды, куды пайду.

— У тым месцы, куды пойдзеш, золата расплавіцца.

* * *

— Андрэй, дзе праводзіш вечары?

— Дома, з жонкаю.

— Гэта ад любві?

— Не, ад радыкуліту.

ISSN 0546-1960